Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

№ 52 (2943)
29 снежня 1978 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца з 1932 г.
Цана 8 кап.

Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Беларусі
Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі
Савету Міністраў Беларускай ССР

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыум Вярхоўнага Савета Саюза ССР і Савет Міністраў СССР горача і сардэчна вітаюць і віншуюць рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыю, усіх працоўных Беларусі з вялікім святам — шасцідзесяцігоддзем Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Камуністычнай партыі Беларусі.

За шэсцьдзесят гадоў працоўныя Беларусі прайшлі слаўны шлях гістарычных здзяйсненняў. Пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў на чале з У. І. Леніным, разам з гераічным пралетарыятам і ўсімі рэвалюцыйнымі масамі Расіі яны актыўна ўдзельнічалі ў класавых бітвах супраць царскага самадзяржаўя, буржуазна-памешчыцкага ладу, за ўстанаўленне Савецкай улады, за перамогу сацыялізму. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя вызваліла беларускі народ ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання і адкрыла перад ім шырокую дарогу прагрэсу ва ўсіх галінах грамадскага жыцця.

Беларуская ССР унесла дастойны ўклад у стварэнне і ўмацаванне адзінай шматнацыянальнай дзяржавы працоўных — Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. У выніку ажыццяўлення ленінскай палітыкі індустрыялізацыі, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, культурнай рэвалюцыі непазнавальна пераўтварылася ўсё аблічча Беларусі — раней адсталай ускраіны царскай Расіі.

Вернасць беларускага народа ідэалам камунізму, яго патрыятызм і інтэрнацыяналізм з асаблівай сілай праявіліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны супраць гітлераўскага фашызму. Сыны і дочкі Савецкай Беларусі плячо ў плячо з усімі савецкімі людзьмі са зброяй у руках гераічна змагаліся на франтах, у радах партызан і падпольшчыкаў, самааддана абаранялі заваёвы Кастрычніка, свабоду і незалежнасць Савецкай сацыялістычнай дзяржавы.

Апіраючыся на брацкую дапамогу і падтрымку ўсіх народаў нашай краіны, працоўныя Беларускай ССР за кароткія тэрміны аднавілі разбураную вайной народную гаспадарку, адрадзілі з попелу і руін гарады і сёлы, заводы і фабрыкі, калгасы і саўгасы. За гады пасляваенных пяцігодак Савецкая Беларусь шматразова памножыла свае прадукцыйныя сілы і забяспечвае ўстойлівыя, высокія тэмпы развіцця эканомікі, якая з'яўляецца састаўной часткай адзінага народнагаспадарчага комплексу краіны.

Індустрыяльнае аблічча Беларусі вызначаюць цяпер сучаснае машынабудаванне і прыборабудаванне, нафтахімія і радыёэлектроніка, вытворчасць мінеральных угнаенняў і сінтэтычных валокнаў, развітыя лёгкая і харчовая галіны прамысловасці. Карэнныя пераўтварэнні адбыліся ў сельскай гаспадарцы. Паслядоўна ажыццяўляецца пераход гэтай галіны эканомікі на індустрыяльную аснову, умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база калгасаў і саўгасаў, значна павысіліся ўраджайнасць, валавыя зборы збожжа, бульбы і іншых культур, вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі.

З году ў год павышаецца матэрыяльны і культурны ўзровень жыцця працоўных рэспублікі. Шырокі размах атрымала жыллёвае і культурна-бытавое будаўніцтва. Новых вышынь дасягнулі навука, вышэйшая, сярэдняя і прафесіянальна-тэхнічная адукацыя. Расцвітае нацыянальная па форме і сацыялістычная па зместу культура беларускага народа. Створаны небывалыя раней магчымасці для ўсебаковага, гарманічнага развіцця асобы, актыўнага ўдзелу працоўных ва ўсіх справах дзяржавы і грамадства, што знайшло сваё замацаванне ў новай Канстытуцыі СССР — Асноўным Законе грамадства развітога сацыялізму і Канстытуцыі Беларускай ССР.

Дасягненні Савецкай Беларусі — жывое ўвасабленне вялікай жыццёвай сілы ленінскай нацыянальнай палітыкі, творчай магутнасці разняволеных сацыялізмам духоўных сіл народа. Гэтыя дасягненні непарыўна звязаны з дзейнасцю Камуністычнай партыі Беларусі. Верная марксізму-ленінізму, партыйная арганізацыя рэспублікі выхоўвае масы ў духу камуністычнай ідэйнасці, савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, непарушнай дружбы брацкіх народаў нашай краіны, згуртоўвае і ўзначальвае працоўных у барацьбе за далейшы ўздым эканомікі і культуры Савецкай Беларусі, за паспяховае выкананне гістарычных рашэнняў XXV з'езда партыі, ліпеньскага і лістападаўскага (1978 г.) Пленумаў ЦК КПСС, планаў дзесятай пяцігодкі.

Цэнтральны Камітэт КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР выказваюць цвёрдую ўпэўненасць, што камуністы, усе працоўныя Беларусі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі будуць і надалей памнажаць свой уклад у скарбніцу матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей нашай вялікай Радзімы, яшчэ з большай настойлівасцю змагацца за далейшае павышэнне эфектыўнасці і якасці работы, даб'юцца новых поспехаў у камуністычным будаўніцтве.

Няхай жыве Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка!

Няхай жыве Камуністычная партыя Беларусі — баявы атрад КПСС!

Няхай жыве Камуністычная партыя Савецкага Саюза — натхніцель і арганізатар будаўніцтва камунізму ў нашай краіне!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС | **ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР** | **САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР**

ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА
ПРЭЗІДЫУМУ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР
САВЕТУ МІНІСТРАЎ СССР
ГЕНЕРАЛЬНАМУ САКРАТАРУ ЦК КПСС,
СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР
таварышу Леаніду Ільічу БРЭЖНЕВУ

На пераўтвораную за гады Савецкай улады беларускую зямлю прыйшло светлае і радаснае свята. Слаўнае 60-годдзе Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Кампартыі Беларусі камуністы, усе працоўныя рэспублікі сустракаюць у працвітаючым магутным саюзе савецкіх народаў, цесна згуртаванымі вакол ленінскай Камуністычнай партыі, яе Цэнтральнага Камітэта, гатовыя на новыя здзяйсненні ў імя трыумфу неўміручай справы, ідэй і запаветаў вялікага Леніна.

У Беларусі, як і ва ўсіх брацкіх савецкіх рэспубліках, сукупнай працай рабочага класа, калгаснага сялянства, народнай інтэлігенцыі, усіх працоўных забяспечаны небывала высокі ўзровень развіцця сацыялістычнай эканомікі — арганічнай часткі магутнага народнагаспадарчага комплексу краіны.

Ажыццяўленне палітыкі індустрыялізацыі краіны, творчае выкарыстанне дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі на аснове пераваг сацыялізму, высокі ўзровень палітычнай і грамадзянскай сталасці, агульнай і спецыяльнай падрыхтоўкі, прафесіянальнай культуры рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых далі магчымасць за мінулыя шэсць дзесяцігоддзяў стварыць у рэспубліцы шматгаліновую сучасную індустрыю, павялічыць аб'ёмы прамысловай вытворчасці больш чым у 200 разоў.

У выніку паслядоўнай рэалізацыі аграрнай палітыкі партыі ўсебаковага ўздыму дасягнула сацыялістычная сельская гаспадарка рэспублікі, у якой з нарастаючай эфектыўнасцю інтэгруюцца велізарная дапамога дзяржавы, поспехі прамысловасці, дасягненні навукі, багаты вопыт і самаадданая праца савецкага сялянства.

Няўхільна расце дабрабыт працоўных. У жыццеўладкаванні кожнай сям'і ўсё большую ролю адыгрываюць грамадскія фонды спажывання, уласцівыя толькі сацыялізму. Шырока рэалізуюцца высакародныя гуманістычныя мэты народнай асветы, навукі і культуры. Працоўныя рэспублікі шчодра карыстаюцца вялікімі перавагамі і дабротамі савецкага ўкладу жыцця, багацейшымі магчымасцямі задавальняць усё больш высокія матэрыяльныя і духоўныя патрэбнасці, якія адпавядаюць нашаму камуністычнаму ідэалу.

Беларускі народ глыбока ўсведамляе, што дасягненні рэспублікі, якія атрымалі натхняючую ацэнку ў прывітанні Цэнтральнага Камітэта КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў СССР, сталі магчымымі дзякуючы ажыццяўленню неўміручых ідэй марксізму-ленінізму, перамозе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, пабудове сацыялізму ў СССР, усталяванню ў нашай краіне сапраўднага народаўладдзя, дзякуючы трыумфу ленінскай нацыянальнай палітыкі КПСС, сумеснай узаемаўзбагачаючай працы ўсіх савецкіх народаў-братоў.

У дні светлага і радаснага свята мы, удзельнікі ўрачыстага пасяджэння Цэнтральнага Камітэта КПБ і Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, выказваючы думкі і пачуцці рабочага класа, калгаснага сялянства, інтэлігенцыі, усіх працоўных рэспублікі, шлём Цэнтральнаму Камітэту КПСС, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР, Савету Міністраў СССР, асабіста Вам, дарагі Леанід Ільіч, самыя шчырыя, ідучыя з глыбіні сэрцаў словы гарачай падзякі за тытанічную працу па забеспячэнню паспяховага камуністычнага будаўніцтва ва ўмовах міру, нястомныя клопаты аб шчасці і працвітанні савецкага народа, за нашу цудоўную сацыялістычную яву, за поўны аптымістычнай упэўненасці заўтрашні дзень.

Камуністы, усе працоўныя Беларусі шлюць гарачае святочнае прывітанне, выказваюць сардэчную любоў і вечную ўдзячнасць гераічнаму рабочаму класу Расіі, вялікаму рускаму народу, савецкі патрыятызм і сацыялістычны інтэрнацыяналізм, вернасць рэвалюцыйным, баявым і працоўным традыцыям якіх з'яўляюцца для працоўных усіх нацыянальнасцей натхнёным узорам служэння сацыялістычнай Радзіме.

Мы прыносім шчырую падзяку, найглыбейшую павагу брацкаму ўкраінскаму народу, выказваем удзячныя пачуцці за дружбу і ўзаемадапамогу, шлём гарачае святочнае прывітанне працоўным Узбекскай, Казахскай, Грузінскай, Азербайджанскай, Літоўскай, Малдаўскай, Латвійскай, Кіргізскай, Таджыкскай, Армянскай, Туркменскай, Эстонскай Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, усім народам-братам нашай вялікай шматнацыянальнай Радзімы.

У гэты ўрачысты дзень мы рады далажыць Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі, Савецкаму ўраду, што 60-гадовы юбілей БССР і КПБ рабочы клас, калгаснае сялянства, народная інтэлігенцыя Беларусі сустрэлі новымі поспехамі ў ажыццяўленні гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС. Прамысловасць рэспублікі датэрмінова выканала заданне трох гадоў пяцігодкі па агульнаму аб'ёму вытворчасці. У 1978 годзе пятая частка выпушчанай прадукцыі атэставана Знакам якасці. Працаўнікі сельскай гаспадаркі ў гэтым годзе засыпалі збожжа ў засекі Радзімы амаль у 5 разоў больш, чым у 1965 годзе, паставілі дзяржаве звыш 2,3 мільёна тон бульбы, павысілі прадуктыўнасць жывёлагадоўлі, шырокім фронтам вядуць меліярацыйныя работы, перабудову сёл і вёсак. Істотнымі творчымі дасягненнямі адзначана праца работнікаў навукі, літаратуры і мастацтва.

Аднадушна і поўнасцю адабраючы, цалкам падтрымліваючы мудрую ўнутраную і знешнюю палітыку Камуністычнай партыі, бязмерна радуючыся і па праву ганаручыся велізарнымі поспехамі вялікай Краіны Саветаў, уражальнымі дасягненнямі рэспублікі ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве, камуністы, усе працоўныя Савецкай Беларусі бачаць першаасноў свайго жыцця і працы ў тым, каб і ў далейшым як зрэнку вока берагчы і ўсямерна прымнажаць заваёвы Кастрычніка, непараўнальныя каштоўнасці і перавагі развітога сацыялізму, нястомна мацаваць сваю згуртаванасць вакол роднай Камуністычнай партыі, непарушнае маральна-палітычнае адзінства працоўных усіх нацый і народнасцей Саюза ССР.

Мы запэўніваем Цэнтральны Камітэт ленінскай партыі, Палітбюро ЦК КПСС, Савецкі ўрад, асабіста Вас, дарагі Леанід Ільіч, што камуністы, усе працоўныя Савецкай Беларусі будуць і ў далейшым няўхільна нарошчваць свой уклад у скарбніцу матэрыяльнага і духоўнага набытку савецкага народа, ва ўзмацненне эканамічнай і абаронай магутнасці нашай сацыялістычнай Радзімы, зробяць усё, каб з гонарам выканаць рашэнні XXV з'езда КПСС, паспяхова, з высокімі вынікамі завяршыць дзесятую пяцігодку.

Мы будзем з яшчэ большай энергіяй і мэтанакіраванасцю змагацца за павышэнне эфектыўнасці і якасці работы, за ініцыятыўнае, наватарскае вырашэнне ўсіх пытанняў эканамічнага і сацыяльнага развіцця, за далейшае ўмацаванне савецкага ўкладу жыцця, яго сацыяльна-палітычных асноў і маральных прынцыпаў.

Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік — наша вялікая, цудоўная шматнацыянальная Радзіма!

Слава ленінскай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза—натхніцелю і арганізатару ўсіх нашых перамог!

Няхай жыве камунізм!

МІНСК. 28 СНЕЖНЯ 1978 ГОДА. Прэзідыум урачыстага пасяджэння Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі і Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, прысвечанага 60-годдзю БССР і КПБ.

Фота Л. Эйдзіна.

У БРАЦКАЙ СЯМ'І — ДА НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

На беларускую зямлю, непазнавальна пераўтвораную за шэсць дзесяцігоддзяў гераічнай барацьбы і натхнёнай працы, прыйшло вялікае і радаснае свята. Чатырыжды ардэнаносная рэспубліка адзначае сваё 60-годдзе і 60-годдзе Кампартыі Беларусі.

28 снежня ў Мінску адбылося ўрачыстае пасяджэнне ЦК Кампартыі Беларусі і Вярхоўнага Савета рэспублікі з удзелам прадстаўнікоў партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый, Савецкай Арміі, прысвечанае гэтай знамянальнай даце.

Урачыстае пасяджэнне адкрыў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі **П. М. Машэраў.**

З вялікім уздымам быў абраны ганаровы прэзідыум пасяджэння ў складзе Палітбюро ЦК КПСС на чале з таварышам Л. І. Брэжневым.

Па даручэнні Палітбюро ЦК КПСС П. М. Машэраў зачытаў прывітанне Цэнтральнага Камітэта КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР Цэнтральнаму Камітэту Кампартыі Беларусі, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Беларускай ССР і Савету Міністраў рэспублікі, якое было сустрэта працяглымі апладысментамі.

Далей П. М. Машэраў сказаў: Напярэдадні свята Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнеў прасіў перадаць удзельнікам урачыстага пасяджэння, камуністам, усім працоўным рэспублікі гарачае прывітанне і сардэчныя віншаванні з юбілеем і найлепшыя пажаданні поспехаў у камуністычным будаўніцтве.

Леанід Ільіч з уласцівай яму душэўнасцю ўспамінаў сваё знаходжанне ў Беларусі, сустрэчы з нашымі людзьмі, цёпла гаварыў пра беларускі народ, адзначаючы яго высокія маральна-палітычныя якасці і працоўную стараннасць. Ён прасіў перадаць, што падзяляе нашу радасць, што ў гэты цудоўны дзень ён душою і сэрцам разам з намі.

Цёплыя, пранікнёныя словы прывітання ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР, сардэчныя віншаванні і добрыя пажаданні таварыша Брэжнева саграюць сэрца кожнага з нас бацькоўскай увагай і клопатамі, акрыляюць нас, заявіў П. М. Машэраў.

Асэнсоўваючы веліч і значымасць пройдзенага шляху, адзначыў дакладчык, мы зноў і зноў сэрцам і розумам звяртаемся да вялікіх вытокаў, якія прадвызначылі і абумовілі ўсё тое, што складае славу і гонар, самае важнае і дарагое ў жыцці і лёсе беларускага народа, кожнага савецкага чалавека.

Гэтыя вечна жывыя вытокі — у бессмяротным вучэнні марксізму-ленінізму, увасобленым у рэвалюцыйнай пераўтваральнай практыцы, неадольным шэсці ідэй і справы Кастрычніка, у непарыўнасці самых надзённых інтарэсаў народных са шматграннай дзейнасцю створанай і выхаванай геніем Леніна партыі камуністаў.

Самым галоўным, сапраўды цудоўным і велічным дзецішчам Кастрычніка, уражальным вынікам тытанічнай рэвалюцыйнай пераўтваральнай дзейнасці нашай партыі і савецкага народа стала пабудаванае ў СССР грамадства развітога сацыялізму — вышэйшага дасягнення сацыяльнага прагрэсу, заканамерны этап у станаўленні камуністычнай фармацыі. Яно знамянуе сабой сталасць сцверджанай на зямлі новай, сацыялістычнай цывілізацыі.

Прамоўца з гордасцю гаварыў аб рабочым класе рэспублікі. Разам з гераічным рабочым класам краіны, з усім народам ён бліскуча ажыццявіў сацыялістычную індустрыялізацыю, стварыў магутны прамыслова-вытворчы патэнцыял, забяспечыў за гады Савецкай улады больш чым двухсоткратнае павелічэнне аб'ёму прамысловай вытворчасці Беларусі.

У поўнай меры ўсведамляючы сваю ўзрастаючую адказнасць за найлепшае выкарыстанне магутнага індустрыяльнага патэнцыялу рэспублікі, рабочы клас ідзе правафланговым у шэрагу тых, хто сёння нарошчвае свае намаганні ў барацьбе за рэалізацыю стратэгічнай устаноўкі XXV з'езда КПСС на павышэнне эфектыўнасці і якасці работы, выкарыстанне інтэнсіўных фактараў росту, на ўсё больш шырокае і паслядоўнае спалучэнне дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з перавагамі сацыялізму.

Нельга без захаплення гаварыць пра тых, працягваў П. М. Машэраў, хто самаадданай працай сваёй стварае аснову ўсяго існага на зямлі — вырошчвае хлеб. Усім сэрцам успрыняўшы як сваю кроўную справу аграрную палітыку партыі, працаўнікі вёскі актыўна працуюць над ажыццяўленнем рашэнняў ліпеньскага (1978 г.) Пленума ЦК КПСС, робяць усё для таго, каб найбольш эфектыўна выкарыстаць накіроўваемыя ў калгасы і саўгасы ва ўсёўзрастаючых аб'ёмах матэрыяльна-тэхнічныя і іншыя рэсурсы.

Дакладчык высока ацаніў ролю інтэлігенцыі, якая вырасла з глыбінь народа, у ажыццяўленні культурнай рэвалюцыі, у тым, што ў рэспубліцы, як і ва ўсёй краіне, завершаны пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі, у тым, што Беларусь цяпер стала адным з буйных навуковых і культурных цэнтраў, які ўносіць вялікі ўклад у агульнасаюзную скарбніцу матэрыяльных і духоўных багаццяў.

У гіганцкім узлёце эканомікі і культуры рэспублікі, у пераўтварэнні і аднаўленні нашай старажытнай зямлі, у сцвярджэнні савецкага ладу жыцця — пераможная сіла ідэй Вялікага Кастрычніка, непераможная творчая моц вызваленай працы, стваральная магутнасць ленінскай дружбы ўсіх нацый і народнасцей Саюза ССР. На магутных крылах сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, на крылах ленінскай дружбы народаў беларускі народ узняўся ад бяспраўя і галечы да сацыяльнага і нацыянальнага адраджэння, да вяршынь эканамічнага прагрэсу і духоўнай культуры развітога сацыялізму, да яркага росквіту здольнасцей і талентаў людзей. Узнімаючыся волатаўскімі крокамі пяцігодак, ён пастаянна адчуваў локаць сяброў, дапамогу і падтрымку народаў-братоў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны, працягваў П. М. Машэраў, Беларусь была неад'емнай часткай, стойкім баявым злучэннем вялікага савецкага народа, які змагаўся, яе сыны і дочкі поруч з усімі народамі-братамі на франтах і ў савецкім тыле, у партызанскіх атрадах і ў падполлі нястомна кавалі перамогу над ворагам.

Нямеркнучым подзвігам інтэрнацыянальнага братэрства стала і гераічная эпапея пасляваеннага аднаўлення рэспублікі, калі воля партыі, сіла і стойкасць савецкага характару, высакароднасць, бескарыслівасць, магутнасць вялікай садружнасці савецкіх народаў у самы кароткі тэрмін ўзнялі з руін і попелу разбураную гаспадарку, адрадзілі да новага жыцця разрабаваную, спустошаную, выпаленую беларускую зямлю.

Ад імя працоўных Беларусі дакладчык выказаў сардэчную ўдзячнасць народам - братам Краіны Саветаў за ўсё, што здабыта і заваявана сумеснымі намаганнямі пад чырвоным сцягам Вялікага Кастрычніка, за ўсё, што зроблена і робіцца дзеля шчасця, дзеля сённяшняга і будучага ўсіх народаў шматнацыянальнай сацыялістычнай Айчыны.

Ад імя камуністаў, ад імя ўсяго беларускага народа П. М. Машэраў запэўніў родную ленінскую партыю, яе Цэнтральны Камітэт, Палітбюро ЦК КПСС на чале з таварышам Л. І. Брэжневым, што працоўныя рэспублікі і надалей будуць свята выконваць свой вышэйшы патрыятычны і інтэрнацыянальны абавязак — усямерна мацаваць эканамічную і абаронную магутнасць Савецкай Айчыны, натхнёнай працай сваёй сцвярджаць камунізм.

З прывітаннямі на ўрачыстым сходзе выступілі кіраўнікі дэлегацый: Масквы — член Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар МГК КПСС **В. В. Грышын,** Расійскай Федэрацыі — Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета РСФСР **М. А. Ясноў,** Ленінграда — старшыня выканкома гарсавета **Л. М. Зайкоў,** Украінскай ССР — Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі **А. Ф. Ватчанка,** Узбекскай ССР — кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Узбекістана **Ш. Р. Рашыдаў,** Казахскай ССР — сакратар ЦК КП Казахстана **С. Н. Імашаў,** Грузінскай ССР — кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Грузіі **Э. А. Шэварднадзе,** Азербайджанскай ССР — кандыдат ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Азербайджана **Г. А. Аліеў,** Літоўскай ССР — першы сакратар ЦК КП Літвы **П. П. Грышкявічус,** Малдаўскай ССР — першы сакратар ЦК КП Малдавіі **І. І. Бодзюл,** Латвійскай ССР — першы сакратар ЦК КП Латвіі — **А. Э. Вос,** Кіргізскай ССР — старшыня Савета Міністраў Кіргізскай ССР **С. І. Ібраімаў,** Таджыкскай ССР — першы сакратар ЦК КП Таджыкістана **Д. Расулаў,** Армянскай ССР — першы сакратар ЦК КП Арменіі **К. С. Дземірчан,** Туркменскай ССР — першы сакратар ЦК КП Туркменістана **М. Г. Гапураў,** Эстонскай ССР — першы сакратар ЦК КП Эстоніі **К. Г. Вайна,** а таксама начальнік палітаддзела Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. А. Гагарына генерал-маёр авіяцыі **П. І. Клімук** і іншыя.

Яны сардэчна павіншавалі працоўных Беларусі, камуністаў рэспублікі са слаўным юбілеем, пажадалі ім шчасця і новых выдатных поспехаў у выкананні гістарычных прадвызначэнняў XXV з'езда КПСС.

З уздымам удзельнікі ўрачыстага пасяджэння прынялі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту КПСС, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР і Савету Міністраў СССР, таварышу Л. І. Брэжневу.

ЛЕНІНЫМ ПАЗНАЧАНЫ ПУЦІНЫ

У АДНЫМ СА СВАІХ ВЕРШАЎ народны пясняр беларускай зямлі Якуб Колас пісаў: «Пад гоман бур пылаў наш сцяг змагання, пранесены з баямі ў нашы дні. Мінула ноч. Іскрыстае світанне запальвае нам ясныя агні...»

Гэтыя ясныя агні сёння зырка зіхацяць над усім беларускім краем. У шалахценні святочных сцягоў, у радасці, у шчаслівым адчуванні сілы і бадзёрасці прыйшло да нас вялікае свята, усенародная ўрачыстасць: рэспубліка святкуе сваё шасцідзесяцігодзе і шасцідзесяцігоддзе Кампартыі Беларусі.

Углядаючыся сёння ў час, які мінуў, і пачынаючы свой новы год, Новы год Беларускай Дзяржавы, кожны з нас у гэтыя юбілейныя дні з асаблівай вастрынёю разумее і бачыць тую геніяльную празарлівасць, дальнабачнасць і мудрасць нашай роднай Камуністычнай партыі, якая з самых першых крокаў свае практычнае работы па з'яднанні працоўных людзей сказала ім самую простую і самую геніяльную з усіх часоў ісціну: твая зямля належыць табе, і ты на сваёй зямлі гаспадар. І не проста сказала, але і ператварыла гэтыя словы ў рэальнасць, зрабіла явай, і кожны крок свой, кожны дзень свайго жыцця аддавала і аддае ажыццяўленню ленінскіх запаветаў, справы Вялікага Кастрычніка.

Углядаючыся сёння ў час, які мінуў пасля абвяшчэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, кожны з нас у гэтыя юбілейныя дні з асаблівай вастрынёю разумее, што ў гісторыі зямлі беларускай, якой тысячагоддзі, шэсць дзесяткаў гадоў не больш як адно кароткае імгненне. Але яно, гэтае імгненне, ужо беззваротна аддзягіла нас ад таго змрочнага някрасаўскага вобраза — ён, маўляў, і «изможден лихорадкою», і «больной», і «ямою грудь», — і ўзняло да касмічных вышынь, адкуль планета ўжо шмат разоў чула не «глас божий», а жыццесцвярджальны голас савецкіх касманаўтаў, у тым ліку і галасы сыноў зямлі беларускай.

Углядаючыся сёння ў час, які мінуў, кожны з нас у гэтыя юбілейныя дні з асаблівай вастрынёю разумее, што ўсе гэтыя дзесяцігоддзі, якія беларускі народ пражыў пад сцягам Кастрычніка, былі пражыты ім разам з усёй Савецкай краінай: разам са сваім старэйшым братам рускім народам і народамі братніх рэспублік Краіны Саветаў народ беларускі пароўну дзяліў радасць і бяду, натхнёную шчырую працу і добрыя шчаслівыя надзеі. І менавіта таму мы гэтак хутка адолелі галечу, якую пакінуў нам царызм і якая была асабліва паганай у нас, на былой ускраіне імперыі паноў і падпанкаў, адолелі голад і халадэчу першых дзён, калі даводзілася на пустым месцы закладваць падмуркі новага жыцця, адолелі сваю непісьменнасць, адолелі навуку будаваць новыя фабрыкі і заводы, гарады і вёскі, адолелі ворагаў, якія спрабавалі перашкодзіць нам будаваць гэтае новае жыццё, адолелі і самага страшэннага ворага — фашысцкіх захопнікаў, якія кінулі на нас у гэткім ужо далёкім — і гэткім шчэ блізкім! — сорак першым годзе свае браніраваныя армады, нашпігаваныя нянавісцю і смерцю.

Напад ворага быў раптоўны, але сам вораг не быў для нас нечаканасцю. Ужо тады, калі адна за адной еўрапейскія краіны кіраліся пад фашысцкі бот, мы ўсё выразней і выразней чулі грукат фашысцкіх абцасаў і разумелі, што грукат гэты скіраваны ў наш бок, да нашай зямлі, пагражае нашаму шчасцю.

Мы добра разумелі тады і шчэ глыбей разумеем цяпер, што ў тыя гады страляні не проста ў нашага салдата, а імкнуліся знішчыць новы свет, народжаны Вялікім Кастрычнікам, імкнуліся не проста спаліць нашы гарады і вёскі, а спаліць, сцерці з твару зямлі само разуменне таго, што Чалавек Працы вышэй ад усялякага цара, імкнуліся нашай смерцю забіць, вынішчыць і ў другіх народаў волю і жаданне парваць ланцугі капіталу.

Наша Камуністычная партыя мужна і шчыра сказала тады пра горкую дылему, што паўстала перад кожным з нас: альбо свабода, альбо рабства.

Іншай долі ў нас не было.

І мы выбралі першае — свабоду.

Сёння свет ведае не толькі гэта, але і тое, чаго гэта нам каштавала.

У тыя горкія дні, у чорным дыме смерці над Брэстам, над берагамі Сажа, Бярэзіны і Дзвіны, у палях пад Масквой і ў стэпах пад Сталінградам яшчэ ніхто не бачыў абрысаў будучых помнікаў, што потым узняліся над магіламі герояў і да якіх цяпер ідуць і ідуць людзі, каб аддаць мёртвым павагу і ўдзячнасць жывых. У тыя горкія дні мы не ведалі, колькі прыйшло ў беларускія гарады і вёскі балючых паведамленняў з-пад Масквы і Ленінграда, з-пад Севастопаля і Харкава і з іншых мясцін, дзе кіпелі жорсткія баі, балючых вестак «...загінуў смерцю героя пры абароне Радзімы...», як і не ведалі, колькі пайшло ў самыя розныя гарады краіны адсюль, ад Сажа, ад Бярэзіны і Дзвіны, балючых вестак, складзеных з адных і тых жа слоў: «...загінуў смерцю героя ў баях за вызваленне Беларусі...»

Але ўжо і тады мы добра ведалі, што аднолькава горкі былі матчыны слёзы ў хаце, ля якой расцвітае па вясне беларуская груша-дзічка, і ў хаце, над якою шуміць шырокім голлем сібірскі кедр, і ў хаце, спавітай вінаградными сцяблінамі, сагнутымі гронкамі сонечных зыркіх ягад, і гэтак жа добра ведалі, што аднолькава горка аплаквала Радзіма сваіх абаронцаў, якія аддалі сваё жыццё, каб яна, Радзіма, жыла вольна і без прыгнёту.

Сёння мы дакладна і праўдзіва падлічылі нашы страты, і ў гэтых падліках няма памылак, і гэты ўлік ва ўладзе людзей: імёны герояў не забыты і ніколі не будуць забыты. І нішто не забыта. Аб гэтым нам штодня згадвае і наша памяць, і малыя і вялікія помнікі герояў і абеліскі, і званы Хатыні, і Курган Славы. І гэта справядліва гэтак жа, як і справядлівы сэнс слоў, якія і ўдзень, і ўночы зіхацяць над франтонам Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — «Подзвігу народа жыць у вяках!»

Углядаючыся зараз у наш сённяшні дзень, мы ў гэтыя юбілейныя дні з асаблівай вастрынёю разумеем, як мудра і дальнабачна акрэсліла родная Камуністычная партыя асноўны напрамак нашага руху наперад: усё на дабро Чалавека Працы, усё дзеля дабрабыту працоўнага чалавека!

У імя гэтага паўсталі і ў нас, на зямлі Беларусі, на папялішчах мінулай вайны новыя цудоўныя гарады і вёскі, багата родзяць палі, некалі здзічэлыя і знявечаныя варожым металам. У імя гэтага ідуць з канвеераў беларускія трактары і аўтамабілі, дзівосныя станкі і вылічальная тэхніка, якіх раней не толькі не выраблялі, але і наогул не чулі ў тутэйшых мясцінах. У імя гэтага ўзнімаецца з глыбінь салігорскіх шахт калійная соль і б'ецца ў трубах нафтаправода «Дружба» беларуская нафта, якая гэтулькі стагоддзяў упарта хавалася ад людзей і скарылася толькі волі савецкага чалавека. У імя гэтага штодзень на зямлі Беларусі рукамі яе працавітых людзей, у цеснай працоўнай еднасці з братнімі народамі ўсёй нашай Бацькаўшчыны робяцца справы сапраўды вялізныя і грандыёзныя.

У вечаровы час, калі сталіца Беларусі запальвае свае зыркія агні, іх водсветы адбіваюцца ў вялізных шыбах прыгожага палаца, што стаіць на левым беразе Свіслачы, у якім размешчана Выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі рэспублікі. Вельмі сімвалічна, што гэтыя будынкі — музей Айчыннай вайны і выстаўкі — размясціліся як бы на адной умоўнай лініі, што праходзіць праз цэнтр сталіцы, і гэта нібы адтуль, ад будынка нашай ратнай баявой славы, пачынаецца алея каштанаў, што пасаджаны рукамі былых франтавікоў і партызанаў, алея, якая вядзе да будынка працоўнай славы беларускай зямлі; вельмі сімвалічна таму, што працоўны подзвіг, які завершаны на зямлі Беларусі, роўны таму подзвігу, які здзівіў свет у тыя гады, калі беларускі народ узняўся бараніць сваю волю і незалежнасць, і гэты подзвіг таксама будзе жыць у вяках.

Калі рэспубліка ўзялася аднаўляць разбураную чужынцамі гаспадарку, нібыта грыбы пасля дажджу, за мяжою штодня нараджаліся ўсё новыя і новыя «прарокі», якія то з посмехам, то глыбакадумна паведамлялі свету на старонках газет і часопісаў, званілі праз розныя радыёстанцыі, што тая зямля, па якой прайшоўся вогненны смерч вайны, не адновіцца і праз сто год. Час жорстка пасмяяўся з гэтых і шмат з якіх іншых прароцтваў.

Вялікае заўсёды добра ўбачыш у малым. І сёння, у гэтыя юбілейныя дні свае роднае рэспублікі, кожны з нас як бы ўзіраецца з новай увагай у сябе: сэрцам спасцігае яшчэ глыбей тое, што ў кіпені працоўных дзён заўважаў толькі з аднаго боку, спасцігае і дзівіцца, радуецца, пачувае сябе ўзнёсла. Мая асабістая памяць вяртае мяне ў сорак пяты год, калі я, гвардыі сяржант, прыехаў з Берліна ў свой родны Полацк — маленечкі тады гарадок на правым беразе Заходняй Дзвіны. Выйшаў з вагона з салдацкім рэчмяшком за плячамі і спыніўся, і доўга стаяў, уражаны, не разумеючы, куды ж гэта мяне прывёз цягнік. Быў пачатак снежня, і белае покрыва снегу пазасыпала папялішчы. Не горад, а нейкая ўзгоркавая нізіна ляжала перада мною, і я не адразу, а толькі двойчы папытаўшы стрэчных людзей і добра прайшоўшы, пачаў прыкмячаць знаёмыя з маленства абрысы. Памятаю, як вясною, калі сонца сагнала снег, дымна курыліся коміны і сцены спаленых будынкаў, прасыхаючы ад цяпла, памятаю едкі пах папялішчаў, памятаю высокі, у рост чалавека, быльнёг, што гнаў на сядзібах у вёсках, куды не вярнуліся жыхары, і звонкі — наўздзіў звонкі — посвіст шпакоў на яблынях, якія абвугліліся і стаялі чорныя, як зямля, памятаю чорныя, з блішчастымі, вышараванымі да бляску, зубцамі колы трактара, які падарваўся на фашысцкай міне, падарваўся ўжо ў мірныя дні, памятаю радасныя твары людзей, якія прыходзілі і ў краму і куплялі хлеб ужо без картак...

Цяпер жа, калі я крочу па вуліцах адноўленага, прыгожага і цудоўнага горада па правы бок Заходняй Дзвіны, здзіўляюся звычайна і з яго прыгажосці і яшчэ болей, бадай што, з таго, што цяжка, амаль немагчыма ўявіць сабе,

(Заканчэнне на стар. 6).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ ПЛЕНУМЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

У Мінску 27 снежня адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Пленум ЦК КПБ разгледзеў арганізацыйныя пытанні.

У сувязі з назначэннем тав. Аксёнава А. Н. Старшынёй Савета Міністраў Беларускай ССР пленум вызваліў яго ад абавязкаў другога сакратара ЦК КПБ.

Пленум выбраў другім сакратаром ЦК КПБ і членам Бюро ЦК КП Беларусі тав. Бровікава У. І.

У сувязі з пераходам на іншую работу і выбыццём за межы рэспублікі пленум ЦК КПБ вызваліў тав. Кісялёва Ц. Я. ад абавязкаў члена Бюро ЦК КП Беларусі.

Пастанова ЦК КП Беларусі і Савета Міністраў БССР

АБ ПРЫСУДЖЭННІ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЙ БССР У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі і Савет Міністраў Беларускай ССР, разгледзеўшы прапанову Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры, **пастанаўляюць:**

Прысудзіць Дзяржаўныя прэміі БССР 1978 года:

У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ

Імя Якуба Коласа — **Быкаву** Васілю Уладзіміравічу за аповесці «Воўчая зграя» і «Яго батальён»;

Імя Якуба Коласа — **Пташнікаву** Івану Мікалаевічу за аповесць «Найдорф»;

У ГАЛІНЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ

Імя П. М. Лепяшынскага — **Сімураву** Аляксандру Трафімавічу за кнігу нарысаў «Сказанне аб балгарскім браце»;

У ГАЛІНЕ МУЗЫКІ

Цітовічу Генадзю Іванавічу — за кнігі «Анталогія беларускай народнай песні» і «Аб беларускім песенным фальклоры».

Сакратар Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі П. МАШЭРАЎ

Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР А. АКСЁНАЎ

ЗЯМЛІ НАШАЙ КРОКІ ІМКЛІВЫЯ

Сяўба на Міншчыне. Год 1930 і год 1978.

Генадзь ПАШКОЎ

Бацькоўская зямля

Так бывае знянацку, —
калі ў палях цішыня
зарасее світальна
ці снегам густым заклубіцца
над змакрэлым крылом,
дзе зрунелая спіць збажына, —
светлым шчасцем зямлі
усяго захлісне мяне быццам.

Можа, слоў і не хопіць,
ды толькі ў тканках маіх
тваёй плоці часцінка.
Там цепліцца сіла святая.
Мацярынская мова
ручайкаю лашчыць мой слых,
а кранеш ціха вуснамі —
кожнае слова зайграе.

На радзімай зямлі
ружавеюць марозна снягі
той парой,
калі дзень пачынае хаду па планеце.
Дык успомні часіны ліхія,
і тракты акінь,
паўз якіх абеліскі
барвяна сузор'ямі свецяць.

Сын былой партызанкі,
я сёння ў пушчы тваёй
сустракаю будан
пад шатрамі ялінаў старэчых.
Колькі жудасных бед
крыважэрнейшай з войн
прыняла, Беларусь, ты на плечы!

Як не глянеш навокал —
маўклівыя сведкі тых дзён.
Тут у кроўным братэрстве
бацькі перамогу кавалі,
каб на ўсіх кантынентах
быў сёння твой голас чуцён
гордым гулам турбінаў
і рокатам ворыўнай сталі.

Помніць твой паляшук
круга вёскі гнілое балота:
быў жа свет усяго —
толькі багна між чэзлых імшар.
Сёння шар наш зямны
у праменнай увесь пазалоце
аглядаюць сыны,
баразнуючы зорны абшар.

Хто такі без цябе?
Бо куды б ні паехаў,
заўсёды
з разнатраўем аеліц,
з гаючай блакітнасцю хвой,
з аўтастрадавым рытмам
і ўспышкамі ў вокнах заводаў
маё сэрца у згодзе
і пульс суразмераны мой.

Я іду па зямлі.
Я ствараю даброты зямныя.
Каля сэрца білет камуніста сумленна нашу.
А надарыцца бура,
сустрэнуцца вёрсты крутыя,
я палёгкі у лёса, няскораны, не папрашу.

Хай праменяцца дні, Беларусь,
над тваімі палямі,
зелянеецца рунь,
наліваецца колас цяжкі.
Сёння неба блакітна
ў зеніце святліцца над намі.
Наша радасць зямная,
наш лёс пераможны такі!

БРАЦКІХ СЭРЦАЎ ВІТАННЕ

Высокага вам узлёту!

Дарагія пабрацімы па зброі! Ваша вялікае свята радасцю напаўняе сэрцы ўкраінскіх пісьменнікаў. Ды хіба толькі нашы сэрцы! Сёння мільёны людзей па ўсёй краіне ўрачыста і з любасцю паўтараюць гераічнае і ласкавае імя —Беларусь...

У гэтым слове, як у кроплі расы, адбіваюцца ўсе сонечныя праменні вялікай хады рэспублікі, усе адценні душы беларусаў — іх адвага, вернасць братэрству, натхнёнае працалюбства, суровая гордасць Брэста і Хатыні і натхнёная вера і ўпэўненасць у будучыні. Гэткай жа бачыцца мне ўся Беларусь і цудоўная літаратура, якая сваімі карэннямі моцна заглыблена ў жыццё народа.

Я, як і мае таварышы, шчаслівы тым, што доўгія гады працую поруч з беларускімі пабрацімамі-пісьменнікамі. Цяжка злічыць маіх землякоў, якія таксама працуюць па-брацку ў прамысловасці і навуцы, у сельскай гаспадарцы і культуры вашай рэспублікі...

Радуючыся сёння святу дружбы, братэрству, якое акрыляе Беларусь, жадаю Вам, дарагія пабрацімы, творчага ўзлёту і глыбокіх твораў у імя славы літаратуры, Савецкай Айчыны.

Мікола НАГНІБЕДА.

г. Кіеў.

Беларусь — наша сястра

Сардэчна віншую дарагіх сяброў—беларускіх пісьменнікаў і ў іх асобе гераічны беларускі народ—з радасным святам—60-годдзем Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Кампартыі Беларусі.

У стагоддзях не згасне слава беларускіх партызан-герояў Вялікай Айчыннай вайны!

Няхай усё ярчэй квітнеюць шматгранныя таленты сыноў і дачок народа Янкі Купалы і Якуба Коласа!

Няхай усё больш прыгожымі ўзнімаюцца да сонца гарады і вёскі Савецкай Беларусі —нашай дарагой сястры.

Юлій ВАНАГ.

г. Рыга.

Памяць сэрца

Дарагія сябры, пабрацімы па пяру!

Перш за ўсё прыміце самыя сардэчныя віншаванні ўсім працоўным, усім пісьменнікам з выпадку нашага агульнага свята—60-годдзя роднай Беларусі!

Як шчырае прывітальнае слова рэспубліцы, яе Кампартыі, беларускаму народу я вырашыў адрасаваць вам невялікі верш «Памяць сэрца» — пра тое, як у 1941 годзе, пры абставінах незвычайных, я ўпершыню пачаў знаёміцца з мілай сэрцу беларускай зямлёй, каб парадніцца з ёй на ўсё жыццё. Гэта — слова ўдзячнасці беларускай зямлі за тое, што яна прытуліла мяне ў цяжкія гады, гартавала ў партызанскіх баях супроць захопнікаў і вырасціла да ганаровага грамадзяніна аднаго з гарадоў сваіх.

З сардэчным прывітаннем—

Закі НУРЫ,
былы беларускі партызан-заслонавец, ганаровы грамадзянін горада Оршы.

У гэту ноч мне боязна паверыць...
О памяць!
Ты агнём мяне кранеш.
Навошта зноў ты адчыняеш дзверы
Туды, дзе вораг цэліцца ў мяне?

У гэту ноч мне боязна паверыць...
Раса тады змяшалася з крывёй.
Я поўз і поўз, пакуль высокі бераг
Не ўзняўся франтавою паласой.

У Нёман месяц кінуўся купацца,
І песняю заліўся салавей.
Адчуў я: да сваіх мне не дабрацца,
Ды і куды пайшлі яны, свае?

Пакуту адчуваў я нервам кожным,
І, можа, як прадбачачы бяду,
Я закрычаў адчайна і трывожна,
І рэха адгукнулася:
— Іду-у-у!

Я помню, як уключыны рыпелі,
І мілы голас: «Пацярпі, салдат...»
А хвалі залюляць мяне хацелі,
Нібы матуля шмат гадоў назад.

...Мінулі годы, ды і зараз часта,
Калі пакутна сэрца зашчыміць,
Знаёмы голас абяцаннем шчасця
Мне з берагу далёкага гучыць.

Пераклаў з татарскай Ю. СВІРКА.

Мая маці — Беларусь

Сардэчна віншую Савецкую Беларусь з яе шасцідзесяцігоддзем! Жыццярадасны, зайздросны гэта ўзрост! Ганаруся разам з вамі, што рэспубліка славіцца працай, моцная дружбай... Захапляюся поспехамі народа, багаццем лясоў, хлеба.

Зяяюць агнямі камуністычныя будоўлі, дарогі, масты, гарады і сёлы. Кланяюся легендарнай працаўніцы-зямлі! Шчаслівы тым, што ў гады вайны быў адным з абаронцаў Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Беларуская гучная струна гучыць і ў маёй песні. Няхай мой голас гучыць па свеце, няхай жыве мая маці-Беларусь.

Міхаіл ХАНІНАЎ.

г. Эліста.

ЗАКОНАТВОРЦА

У ЛЮДМІЛЫ Мікалаеўны гэта стала цвёрдым правілам. Як толькі вернецца з сесіі Вярхоўнага Савета БССР, пачынаецца новая гарачая пара. Трэба ж людзям расказаць, што вырашалася там, у Мінску, падзяліцца сваімі ўражаннямі, выказаць думкі, якіх «назапасіла» на сесіі. Мо таму і апошні тыдзень выдаўся такі багаты на сустрэчы, запамінальныя падзеі. Кожны дзень яна гутарыла з людзьмі на фермах, у брыгадах, сустракалася са школьнікамі і настаўнікамі, навучэнцамі прафесійна-тэхнічнага вучылішча. Расказвала і пра бюджэт рэспублікі, яе народнагаспадарчы план, пра Закон аб выбарах у Вярхоўны Савет рэспублікі. Безумоўна, людзі зараз адукаваныя, чытаюць газеты, слухаюць радыё. Пра ўсё гэта яны ці чыталі, ці чулі, але ж пачуць жывое слова ад дэпутата... А як прымаюцца законы? А хто іх стварае? Такія пытанні зададуць у кожнай школе. Па сутнасці, і Людміла Мікалаеўна раней ведала пра гэта таксама ў агульных рысах. Калі ж абралі яе членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, з усімі гэтымі пытаннямі давялося сутыкнуцца на практыцы.

Учора ў мясцовай школе ў яе так і спыталі:

— Як, Людміла Мікалаеўна, ствараюцца законы? Як працуе Прэзідыум Вярхоўнага Савета?

Вочы гарэзы-хлапчука свяціліся такой непадробнай цікаўнасцю, што Людміла Мікалаеўна мусіла больш чым гадзіну расказваць пра ўсё.

А пачала яна з таго, што Прэзідыум Вярхоўнага Савета, як і ўсе нашы савецкія органы, працуе па плану. Напярэдадні кожнага года кожны член Прэзідыума атрымлівае праект плана, знаёміцца з ім. На адным з пасяджэнняў (дарэчы, яны праходзяць штомесяц) план абмяркоўваюць. Уносяцца змены, улічваюцца прапановы. І, нарэшце, план прымаецца. Вось зараз абранцы народа і вырашаюць пытанні, якія запланавалі. Безумоўна, жыццё не стаіць на месцы. У плён могуць быць унесены змены, наспявае неабходнасць вырашыць такое пытанне, якое раней не меркавалася. Зноў жа, гэта вырашаецца на Прэзідыуме, дзе і робяцца адпаведныя карэктывы.

Расказала дзецям Людміла Мікалаеўна і пра тое, як праходзяць пасяджэнні Прэзідыума. Матэрыялы для разгляду на кожным з іх рыхтуюць супрацоўнікі апарату Прэзідыума ці члены пастаянных камісій Вярхоўнага Савета рэспублікі. Яна, як і ўсе члены Прэзідыума, атрымлівае напярэдадні пасяджэння ўсе матэрыялы, праекты пастаноў. Пры жаданні можа ўносіць змены, выказваць свае прапановы.

Што рашаецца на пасяджэннях? Самыя розныя пытанні. І тое, як удзельнічаюць Саветы народных дэпутатаў у выкананні народнагаспадарчых планаў, як захоўваецца сацыялістычная законнасць і ўмацоўваецца правапарадак, як вядзецца будаўніцтва ў горадзе ці вёсцы, як ахоўваецца здароўе працоўных, як яны забяспечваюцца камунальна-бытавымі паслугамі... Словам, члены Прэзідыума ўнікаюць ва ўсе пытанні нашага шматграннага жыцця. А яшчэ на пасяджэннях прымаюцца Указы Прэзідыума аб узнагародзе пэўных людзей медалём «Ветэран працы», прысвойваюцца званні «Маці-гераіні», разглядаюцца хадайніцтвы аб прыёме ў грамадзянства рэспублікі, просьбы асуджаных аб памілаванні...

Расказвала гэтак Людміла Мікалаеўна вучням, а перад вачамі стаяў той дзень, тое пасяджэнне, на якім яна выступіла з прапановамі. А было гэта якраз тады, калі ўвесь наш народ горача абмяркоўваў праект новай Канстытуцыі рэспублікі. Людміла Мікалаеўна ведала, што побач з ёй у Прэзідыуме будуць сядзець добра знаёмыя, шчырыя людзі: шліфавальшчык завода аўтаматычных ліній Канстанцін Паўлавіч Саленік, акадэмік Аляксандр Сямёнавіч Махнач, партыйны работнік Юрый Мініваліч Хусаінаў. Сэрцам усё разумела Людміла Мікалаеўна, але хваляванне не пакідала яе: падумаць толькі, яна, простая жанчына, дачка патомных хлебаробаў, будзе ўносіць свае прапановы ў новы Закон. Гэтае хваляванне пачалося яшчэ дома, калі яна рыхтавалася да выступлення. І толькі супакоілася крыху тады, калі зайшла да сакратара Прэзідыума Елізаветы Пятроўны Чагінай, вельмі сардэчнай і добразычлівай жанчыны. Гэта стала традыцыяй: прыязджае Людміла Мікалаеўна ў Мінск — абавязкова заходзіць да Чагінай. Елізавета Пятроўна заўсёды ўважліва выслухае, запытаецца аб просьбах выбаршчыкаў, параіць да каго звярнуцца, каб вырашыць тое ці іншае пытанне. І на гэты раз выслухала Елізавета Пятроўна Людмілу Мікалаеўну, усміхнулася:

— І мне вядома гэтае пачуццё. Вось, слухайце, як у мяне аднойчы было...

Расказала прыдатны да выпадку эпізод са свайго жыцця, з гумарком, дасціпна, папытала пра дзяцей. Словам, зняла нервовае напружанне.

— Выступае брыгадзір ордэна Леніна калгаса «Аснежыцкі» Пінскага раёна, Герой Сацыялістычнай Працы Людміла Мікалаеўна Журбіла, — аб'явіў Старшыня.

І яна пачала сваё выступленне.

— Мяне, як работніка сельскай гаспадаркі, вельмі радуе, што ў Асноўным Законе вялікая ўвага надаецца далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі, — гаварыла шчыра і проста. — Асаблівае задавальненне выклікае 22 артыкул Канстытуцыі БССР, у якім падкрэслена неабходнасць «ператварэння сельскагаспадарчай працы ў разнавіднасць індустрыяльнай; расшырэння ў сельскай мясцовасці сеткі ўстаноў народнай асветы, культуры, аховы здароўя, гандлю і грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання і камунальнай гаспадаркі; пераўтварэння сёл і вёсак у добраўпарадкаваныя пасёлкі». Усё гэта зразумела і дорага нам, хлебаробам.

Людміла Мікалаеўна гаварыла пра патрэбы дэпутатаў, пра тое, што арганізацыі і ведамствы павінны адносіцца з большай адказнасцю да іх прапаноў. Гэта трэба і падкрэсліць у новай Канстытуцыі БССР. І яшчэ — што ўзмацненне ролі Саветаў, прафсаюзаў, камсамола, кааператываў і іншых масавых арганізацый, працоўных калектываў (гэта трэба больш выразна падкрэсліць у Асноўным Законе) паслужыць далейшаму паглыбленню і развіццю сацыялістычнай дэмакратыі.

Калі Канстытуцыя БССР была прынята, Людміла Мікалаеўна з задавальненнем адзначыла, што яе папраўкі, як і сотні іншых, што ішлі тады ад працоўных у Канстытуцыйную камісію, былі ўлічаны.

У адным толькі «памылілася» Людміла Мікалаеўна. Калі на пасяджэнні Прэзідыума расказвала пра ход спраў у іх ардэнаносным калгасе, пра ўраджай у сваёй брыгадзе і выхад мяса на ферме. Меркавала, што яе брыгада збярэ па 58 цэнтнераў зерня з гектара. Але калі падлічылі, то ўраджай склаў больш за шэсцьдзесят цэнтнераў. 2016 моч зерня сабралі ў брыгадзе. Столькі, колькі пяць гадоў назад з усіх палеткаў калгаса. Нічога не скажаш, памылка прыемная!

— Такія «памылкі», Людміла Мікалаеўна, не засмучаюць, а радуюць людзей, — задаволена сказаў Іван Яўцеевіч Палякоў, калі даведаўся пра гэты выпадак.

Расказвала і пра гэта школьнікам Людміла Мікалаеўна.

Зіма накінула бялюткі дыван на палі, тоўстым пластам легла на дарогу. Але ў Людмілы Мікалаеўны не паменшала спраў. З раніцы сядае яна ў сваю машыну «Ніва» — падарунак за добрую працу — і едзе па калгасе. Усюды трэба пабываць дэпутату: і на ферме, і ў механізатараў, і ў школьнікаў, і ў выбаршчыкаў, якія звярталіся да яе з просьбамі. Там-сям з цяжкасцю даводзілася прабівацца праз снегавыя сумёты. Тады яна выходзіла з машыны, брала рыдлёўку, расчышчала дарогу. І гэтак кожны дзень. На працягу ўсяго тыдня. За тыдзень прытамілася. А тут яшчэ хвароба пачала дацінаць. Урачы казалі, што трэба было б легчы ў бальніцу. А як ляжаш, калі столькі спраў яшчэ не перароблена! Як будзеш спакойнай у бальніцы, калі сын вось-вось павінен вярнуцца з флоту. Тры ж гады не бачыліся. А ён чамусьці не едзе. Так і сказала ўрачам.

У нядзельны дзень наважылася Людміла Мікалаеўна пабыць дома. Меркавала і ўстаць пазней. Але дзе там! Ці то ўнукі разбудзілі — у дачкі Галі двое немаўлят,—ці то прывычка выпрацавалася, але прачнулася рана. Толькі паспела прыбраць у хаце, як у дзверы пастукалі. На парозе стаяла Люба Жылевіч.

— Праходзь, Рыгораўна, садзіся, — запрасіла яна лепшую калгасную даглядчыцу жывёлы. — Што новенькага чутно?

— Ды хіба не ведаеш навіну, Мікалаеўна, —усміхнулася Любоў Рыгораўна. — Радасць жа ў мяне. Усялілася ў новы дом. Вось прыйшла прасіць, каб завітала на наваселле.

— Дзякую, Рыгораўна, дзякую.

— Гэта я табе дзякуй павінна сказаць. Паспрыяла, паклапацілася.

Сапраўды, дэпутат Журбіла зрабіла ўсё, каб яна, ды яшчэ Дамініка Пятроўна Лебядзеўская, да зімы перабраліся ў новыя цагельныя дамы. Працаўніцы яны дужа руплівыя, а вось жылі ў старых хатах. Людміла Мікалаеўна пайшла да старшыні калгаса Уладзіміра Антонавіча Ралько, дамовілася аб цэменце і цэгле, аб будаўніках. Безумоўна, усё гэта за іх грошы. Грошы ў людзей зараз ёсць, асабліва ў аснежынцаў. Хаця б тая Дамініка Пятроўна. Не менш чым 250 рублёў атрымлівае за месяц! А вось будаўнічых матэрыялаў не хапае. Але Уладзімір Антонавіч паабяцаў. Калі ж ён паабяцае — зробіць. І неўзабаве ў Любелі пачалі будаваць два дамы.

— Добра табе працаваць, выконваць свае дэпутацкія абавязкі, — гаварылі ёй знаёмыя на сесіі. — За Уладзімірам Антонавічам ты, як за мураванай сцяной. Чаго сама не даб'ешся, ён дапаможа.

У гэтых словах была вялікая доля праўды. Ралько — двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. Чалавек паважаны, аўтарытэтны. Таму многія пытанні, якія даводзіцца вырашаць Журбіле як дэпутату, яна ўзгадняе з Уладзімірам Антонавічам. Сумесна вырашаюць іх. Скажам, калі задумалі будаваць дарогу з Аснежыц у Купяцічы. Разам з Ралько ездзілі да старшыні суседняга калгаса «Дружба народаў» Анатоля Аляксандравіча Норкіна. «Хіба ў нашых узорных гаспадарках нельга зрабіць, каб і дарогі былі ўзорныя?» — пыталіся. Прыйшлі да згоды, на паях, як кажуць, пачалі будаўніцтва. І правялі дарогу што трэба...

— Дык я чакаю вас з Антонам Сямёнавічам увечары, — гаварыла між тым Жылевіч. — Ты ды Уладзімір Антонавіч будзеце самымі жаданымі маімі гасцямі.

Пайшла Любоў Рыгораўна, а Людміла Мікалаеўна парашыла сыну пісьмо напісаць. «Дарагі сынок, — вывела на паперы. — Што там у цябе здарылася? Чаму даўно пісьма няма?..»

У Любелі стаяў сонечны марозны дзень... Жыла сваімі клопатамі, гаманіла вёска...

А. АСТРЭЙКА.

ЛЕНІНЫМ ПАЗНАЧАНЫ ПУЦІНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 4).

што тут вось, на месцы гэтых прыгожых гмахаў, былі пустэча, варонкі ад снарадаў і фашысцкіх бомб, што на месцы высокіх разгоністых яблынь, што густа растуць вакол помніка героям-гвардзейцам, якія загінулі, вызваляючы горад ад чужынцаў, некалі горбіліся заржавелыя спінкі абгарэлых ложкаў і чорны задымлены цагляны друз. Штогод вясною зацвітаюць гэтыя яблыні пышна і дружна, зацвітаюць звычайна намнога раней, чым ва ўсіх прыгарадных садах, і тут, у цэнтры горада, робіцца бела і святочна ад густой квецені, і ружова-белыя пялёсткі засцілаюць асфальт плошчы, прыступкі помніка, і вецер выносіць тыя пялёсткі на алеі, дзе гуляюць дзеці, выносіць на бераг Дзвіны, і спакойная плынь вады гоніць іх уніз, пад самы полацкі бор, у якім збудаваны і разбудоўваецца далей беларускі гігант нафтавай прамысловасці — нафтаперапрацоўчы завод. Горад па правы бок Дзвіны завецца цяпер — Стары Полацк, а новы горад хімікаў па левы бок Дзвіны завецца Новым Полацкам. Гэта адсюль, ад гэтых мясцін, дзе некалі былі партызанскія сцежкі, пачаў сваё новае жыццё беларускі бензін, беларускі поліэтылен і іншыя вырабы з нафты. Гэта тут, стаўляючы першую палатку будаўнікоў нафтаграда, былы першы камсорг будоўлі, а цяпер беларускі паэт Валянцін Лукша складаў песню, якая потым абляцела ўсю краіну і хвалявала маладыя сэрцы рамантычнай узнёсласцю і клікала ў новыя дарогі. Гэта тут, у гомане будоўлі, вядомы беларускі празаік Тарас Хадкевіч знайшоў герояў свайго рамана «Песня Дзвіны», які ўславіў гераічную працу беларускіх хлопцаў і дзяўчат, і хлопцаў і дзяўчат з Масквы, Омска, Новасібірска, Ташкента і іншых мясцін Савецкай краіны, якія адзіным дружным рэем вялі напружаную працу і збудавалі камбінат, якім сёння ганарыцца беларуская зямля. Гэта тут, услухоўваючыся ў гоман бору, выдатны паэт сучаснасці лаўрэат Ленінскай прэміі, Герой Сацыялістычнай Працы, зямляк палачан Пятрусь Броўка — напіша задушэўныя і ўсхваляваныя радкі, поўныя шчырай любові да свайго роднага краю: «Лясы, надзвінскія, лясы! Не знаю большае красы...»

Так, няма на свеце большае красы, чым родная зямля, зямля бацькаўшчыны, якую, кажучы словамі паэта, кожны савецкі чалавек «завоевал и полуживую выняньчил», якую ўпрыгожыў зараз новымі гарадамі і вёскамі, фабрыкамі і заводамі і якая шчодра дорыць яму багаты плён за працу старанную, дбалую і шчырую, якая зычыць заўтрашні дзень яшчэ багацейшы за сённяшні. Нам усім, гаспадарам свае зямлі, свеціць сонца ленінскай праўды, і кожны з нас сёння з радасцю ў сэрцы паўтарае паэтычныя радкі народнага песняра беларускай зямлі Якуба Коласа: «Жыві, народ свабоднае краіны! Квітней ты, беларуская зямля! Нам Леніным паказаны пуціны і зорамі асветлены Крамля!»

Шырокія і цудоўныя гэты пуціны! Шырокая і цудоўная дарога, што вядзе нас у заўтрашні дзень, і над гэтай дарогаю справы нашы, плён працы нашай — як зоркі першай велічыні; і шмат прасторы на гэтай дарозе, і ўсё святлейшая далеч, і ўсё магутней наш крок, і ўсё больш святла і радасці ў нашых сэрцах, і ўсё ярчэй палымнеюць нашы сцягі, што лунаюць над намі, — сцягі Вялікага Кастрычніка. І на гэтай дарозе да шчасця народнага, дарозе, якую накрэсліў нам Вялікі Ленін, усім працоўным людзям ёсць месца. І кожны, хто ўзышоў на гэтую дарогу, ужо непадзельная часцінка яе, ён ужо разам з ёю і абавязаны справаю сваёй і адданасцю апраўдаць права лічыць яе сваёю і крочыць па ёй.

Вось чаму сёння мы ўсім, хто быў з намі разам у баях і хто зараз разам з намі ў працы, усім, хто з намі і ў дні сумныя, і ў дні сонечныя і радасныя, з хваляваннем у сэрцы гаворым: наша свята — гэта і ваша свята, бо без вас яго ў нас магло і не быць.

Дык, калі ласка, да нас, на наша агульнае свята, свята працы і братняй любові нашай! Хай жа будзе шчасным кожны дзень Новага года нашага, хай толькі сонца свеціць у нашы вокны, хай штодня бруіцца радасць у сэрцы кожнага з нас, хай штодня багаты плён вянчае нашу працу, хай кожную раніцу мірнае неба адкрывае нам наш новы дзень!

Алесь САВІЦКІ.

НА ПЛАНЕЦЕ СЭРЦА

РАНІЦА новай кнігі Аляксея Пысіна пачалася з крокаў. Чуў, як ступалі па зямлі. Вялікай, роднай. «Чыесьці крокі ўсё грымелі...». І зямля ўздрыгвала. «Была радня аж дзесьці ў Саматэвічах, за Бесяддзю, за полем і барамі. У вёсцы тут прыгадваюць Бялькевіча: «Краёвы слоўнік нам збіралі...». Засталася на ўсё жыццё песня, «што на крыві стаяла». Засталіся «белыя сцюжы зімою, белыя птушкі вясной». Застаўся лес, па якім «вы, продкі, йшлі, і стогн птушыны біў, як і ў гэтую часіну». І — боль. Боль часу, боль памяці, боль сяброў і сыноў, дзікага голуба на прыцэле ў браканьера, боль далёкага прадчвання:

Яшчэ няўцешна ўдовы
не галосяць,
Яшчэ касцоў гарматы
не гукалі.
І тыя, што забіты, сена
косяць,
Ядуць на лузе сала
я агурнамі...

Няпроста гэта — глядзець на свет вачамі пасаджанай бярозкі. Няпроста гэта і так звычайна для паэта адчуваць свет крыламі пчалы ў час медазбору і птушкі, што імкнецца да сваёй шпакоўні, пазнаваць смак быцця «мурашкаю, што сок з пянька пянёчка выпіла». Няпроста гэта—і патрэбна, патрэбна, патрэбна! Патрэбна людзям, чалавецтву. Мо таму ўсё часцей горнецца талент паэта да таго, «што нам баліць», што вымагае быць добрым у людской сям'і, дапамагае перасіліць хвілінны гнеў. Дзеля радасці нашай, шчасця дзяцей, дзеля самага галоўнага на зямлі. Дзеля шчырасці і трапяткога пачуцця, якімі споўнены ўсе да аднаго вершы кнігі паэта.

А. Пысін заўсёды ў дарозе—да планеты чалавечнасці, планеты любові:

Не на іншую сыдзеш
планету,
Захачу—даганю, будзе след.
Схамянуўся—ні сцежкі,
ні следу,
Толькі луг, толькі лес,
толькі свет.

Я гляджу праз гадоў
павалоку:
Не гукнуць, не дагнаць,
не дайсці.
Усміхаешся блізка
здалёку,
Як зялёная зорка ў лісці.

А навокал — снег. Той самы «госць каля парога», што стукаецца ў дзверы яшчэ з маленства, той самы «перажытых зім сааўтар», што аберагае і кожную зіму нясе новую і заўсёдную радасць адкрыцця. Снег светлай споведзі і любві да зямлі. А яшчэ—прывід той далёкай пары, што нагадвае зноў і зноў: «Лёсаў колькі вайна памалола!.. Чорным снегам сыпнула зіма». Тая ваенная зіма для А. Пысіна—незабыўная, незагойная, штодзённая.

Не выбіраў лёгкія шляхі, не абмінаў франтавыя пагоркі, перавітыя дратамі смерці, не сыходзіў са сцежак адвагі, мужнасці, вернасці народнаму лёсу. І, можа, таму, што душа паэта такая чыстая, гартаваная ў агні грамадзянскага подзвігу, такая да болю сціплая, якая яна бывае ў франтавіка, воіна, можа, таму і вырываюцца з яе словы: «Я ведаю—я вінаваты, са мною, за мною віна...». Гэта не прызнанне ў слабасці, гэта—яшчэ адна прысяга на мужнасць, гатоўнасць прыняць на сябе новыя клопаты, адказнасць за ўсё, што адбываецца навокал. І за людзей, і за праўду. Гатоўнасць пажадаць самаму прыгожаму зверу светлых дзён і ўтульнага лёсу і схамянуцца: «мне пабачыць бы аленя... зноў я чую блізкі стрэл». Гатоўнасць зрабіць выклік «мярцвячыне»:

Жыло сумленне, ды яно
Забіта ў сэрцы тым даўно—
Забіта сытасцю,
Забіта хітрасцю,
Забіта сквапнасцю,
Забіта святасцю,
Забіта хіжасцю
І іншай іншасцю.

Аграномам ачышчальнай вясны прайсці па жыццёвым полі, прывеціць новую рунь, новыя перамогі і здзяйсненні і не пабаяцца прызнанняў:

А я ні ў чым нікога не віню,
Бо ведаю, што сам у першым
класе
Маўкліва ў вечнай вернасці
пакляўся
Сваёй зямлі,
і плугу,
і каню.
Але бываю ў вёсцы ўсё
радзей
І развучыўся плугам
я валодаць,
І, хоць люблю я луг і ў лузе
лотаць.
Які зямлі я сёння дабрадзей?

Гэтае горкае прызнанне мацнейшае за многія-многія вершы пра паездкі ў вёску, часовыя наведванні родных мясцін, слёзную кляцьбу ў вернасці плугу і баране паэтаў з гарадской прапіскай. Мацнейшае — бо праўдзівае, шчырае.

Радок за радком... Усё праўдзіва, зразумела, дагаворана. Не, гэта не тая праўда, што грашыць павярхоўнасцю, не тая зразумеласць, што можа здрадліва адступіцца ад цябе, не тая дагаворанасць, што сваячыць з бяздушнасцю. Гэта тыя праўда, зразумеласць, дагаворанасць, за якімі стаяць на поўны рост мужнасць, шчырасць, патрабавальнасць, і ў першую чаргу—да сябе.

Вернасць клятве пазнаецца і ў самых простых і глыбокіх гэтай чалавечай прастатой адкрыццях. Штодзённа вучыць сябе бачыць свет і людзей, адкрываць нанава тыя звычайныя ісціны, якія ніколі не вычэрпваюцца да дна. Здаецца, сустрэў земляка: «Бачу, рысы тыя і не тыя. Вінаватая усмешка стыне». Проста абазнаўся, не прызнаў, не разгледзеў?.. І прызнаў, і разгледзеў. Паэт убачыў чалавека, убачыў і адчужанасць, і ўсё тое, што часам раздзяляе людзей у натоўпе. Паэт па-сапраўднаму ўбачыў чалавека і таму намаляваў яго партрэт тымі жывымі фарбамі, якія дало жыццё. І ўявіў свайго земляка ў тым краі, дзе сам нарадзіўся, дзе ўсё блізкае і знаёмае з маленства:

І прыкметны, і вядомы ты
На зямлі той добрай,
мой таварыш,
На якой жывеш, працуеш,
марыш,
На якой штодзённыя сляды.

Там і вуліцы, і цень страхі,
І буслы, знаёмыя
з маленства,
Дамалёўваючы падабенства,
Да аблічча дадаюць штрыхі.

Любіць чалавека — значыць, бачыць яго ў сувязі з усім, што акружае чалавека, што ўзбагачае яго жыццё. Любіць чалавека—значыць, цаніць яго мерай народнай мужнасці і перамогі. Любіць — значыць, разумець і паважаць. Гэтая любоў гартавалася яшчэ ў тыя франтавыя гады, калі хтосьці з той стралковай роты «падняўся першы. І загінуў... Ты быў другі. А можа, соты»...

Ёсць суровае слова—біяграфія. Біяграфія «людской прызнасці», штодзённая справаздача «ўсяму, што ў лесе, полі, лузе». Жыццё, што ведае горыч страт, дым франтоў. Паэт і сёння, як некалі, ідзе да планеты мужнасці. Планеты, на якой ёсць гарадок, у якім А. Пысін хацеў бы сустрэцца з палітрукам Доўжыкам. З'ехаў палітрук, з'ехаў у Істру. «Я ведаю, пры чым тут Істра!». Ведае, бо там «франтавое поле, поле, там найглыбейшае з палёў — па ім, па ім ён роту вёў — о поле бою, поле болю...».

А сустрэчы — на кожным кроку. Вітаецца з паэтам стары кантужаны франтавік. Сцерліся ў памяці крыўды. Засталіся толькі дрэвы, неба, галубы. Засталася служба сонцу.

Сустрэчы не даюць прыпыніць крок... На далёкай латгальскай зямлі яшчэ жыве стары праваднік «у белым палатняным», які ведаў дарогу з кратэра вайны ў будучае, які вывеў... З грукату бою каля дзюнаў, ад магіл дарагіх сяброў, апіраючыся на кавеньку дзевятага дзесятку, ідзе ў бяссмерце герой Ледуана. Пысін-паэт неаддзельны ад Пысіна-воіна:

Абяцаў я ўсім даволі
Светлай радасці і свят.
А на свеце войны, войны,
І таму я й сам салдат.

Таму і грукае планета ў сэрца, расхваляванае землятрусам у Ташкенце, таму і ўзнікае даўняя трывога: «Толькі б, толькі б не землетрасенне, што рыхтуюць людзям людзі самі».

З думкамі пра сённяшняе паэт міжволі вяртаецца ў мінулае, у сваю вогненную маладосць, вяртаецца, каб дакладней, як на франтавой карце, вызначаць месца ў жыцці, барацьбе, працы: «О, слова, слова лабавое, нястрымнае, яно ляціць, пасля душа мая баліць: сказаў не так, сказаў не тое...». Вітаецца з добрымі людзьмі, роднымі палямі, дрэвамі і птушкамі, каб раптам, перамагаючы боль у левым баку грудзей, азірнуцца і ўбачыць на экране памяці: «Мой камбат апусціўся забіты і я побач з камбатам ляжу». Азірнуцца і павесялець душою ад сустрэчы з роднай пяхотай у звычайнай... лазні. Стрыманы франтавы гумар і сёння бярэ па прыцэл добрай усмешкі тых, з кім часам зводзіць дарога:

Жанчына так апавядала:
— Усю дарогу да вакзала
Я на адной назе стаяла:
Аўтобус повен, ледзь паўзе.
Стаю, а на маёй назе
Яшчэ аж дзесяць чалавек...

Пераводзіць маленькую, на першы погляд, драбніцу ў вялікае абагульненне і бачыць вялікі свет у найтанчэйшых драбніцах, удыхаць жыццё у нерухомае і малапрыкметнае і фіксаваць у імгненні няспынны рух падзей — унутраная творчая патрэба А. Пысіна.

З хваляваннем паэт звяртаецца да маладога пакалення. Кожнай жылкай верша А. Пысін звязаны з роднай зямлёй, з народным лёсам, з мінулым і будучым, з палыновымі акопамі сваёй мужнай маладосці і з маладосцю сённяшняга дня. У адным з яго вершаў ёсць такія радкі:

Пішу я на сасне,
Што сшыткам стала мне,
Паперай стала...
Пішу пра смерць, пра кроў,
Пішу я пра сяброў,
А іх жа, родных,
Хавалі на вайне,
Хавалі не ў труне,
І запаветам мне:
«Пра нас раскажаш...».

Паэт расказаў і расказвае. Паэт апаліў нашы сэрцы мужнай, шчырай, трапяткой праўдай. На ўсё жыццё. І таму так звонка падымаецца жаўранак «ад сырой зямлі да паднябесся», так шчодра кувае зязюля ў садзе жыцця, так жытнёва на планеце паэтавага сэрца.

Валянціна КОЎТУН.

А. Пысін. Ёсць на свеце мой алень. Вершы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1978.

ЗЯМЛІ НАШАЙ КРОКІ ІМКЛІВЫЯ

«Гомсельмаш», год 1929.

«Гомсельмаш» сёння.



Першы трамвай на вуліцах Мінска. 1929 год.

Першы тунель Мінскага метрапалітэна. 1978 год.

МОЙ ГОРАД

I

Калі загараюцца ў горадзе родным агні
І мякка кладуцца на сцены яго светацені,
Я Час заклікаю: вярні, хоць на момант вярні
Стракаты ўспамін у ружова-праменным
спляценні!

МОЙ РОДНЫ ГОРАД!
З вялікай любоўю вымаўляю я яго імя на восьмым дзесятку свайго жыцця. З вялікай гордасцю вымаўляю словы: я — мінчанін!

На былой яго Скобелеўскай вуліцы (цяпер Чырвонаармейскай) нарадзіўся я на свет. І з таго часу праз усё маё жыццё праходзіць мой родны горад, хоць не раз жыццёвы лёс разлучаў нас на доўгія гады... Тым даражэйшымі былі нашы новыя сустрэчы.

Гэта светлае пачуццё — адчуванне сваёй радзімы, адчуванне гарачай любові да ўсяго таго, з чым звязаны гады дзяцінства, гады юнацтва, гады сталасці. А мая радзіма, мой «родны кут» — гэта мой Менск, Менеск, Мінск! З ім звязаны важнейшыя падзеі ў маім жыцці...

Скрозь далёка не ружовы туман майго дзяцінства выразна праступаюць абрысы даўняга Мінска з яго цэрквамі і цэркаўкамі, касцёламі і сінагогамі, нават з кірхаю і мячэццю! З яго вузенькай—у тры аршыны —Касмадзем'янаўскай, з яго Нямігай, Ляхаўкай, Камароўкай, Захараўскай, Губернатарскай, Паліцэйскай... З яго крывавым губернатарам Курловым, з яго гарадавымі і жандарамі, з раскошай багатых жыхароў каменнага цэнтра і жабрацтвам і цемрай жыхароў яго рабочых драўляных ускраін...

Належачы сам да гэтага апошняга саслоўя, я рана спазнаў нястачу і гора, асабліва, калі ў 1914 годзе бацьку забралі на фронт, а Мінск стаў прыфрантавым горадам, праз які ішлі на бойню са ўсяе Расіі маладыя і пажылыя салдаты... Давялося мне пабачыць тут і апошняга манарха Расійскай імперыі, калі ехаў ён пад Баранавічы на фронт праз Мінск... Памятаю я, і як кайзераўскія салдаты падкаванымі ботамі тапталі вуліцы былога губернскага Мінска. Памятаю, і як войскі Пілсудскага і легіёны Доўбар-Мусніцкага хацелі паланіць мой родны горад, далучыць яго да Рэчы Паспалітай... Я памятаю, як, адступаючы, гэтае трусліваe воінства запаліла са ўсіх канцоў мой горад, як ненажэрны агонь знішчаў цэлыя кварталы яго... Гарэлі «Кашары», гарэлі «Манапалька» і гарбарні на Ляхаўцы, гарэлі пакгаузы на Аляксандраўскім вакзале, гарэлі ваенныя склады на Правіянцкай, гарэлі жылыя кварталы на Траецкай гары, увесь горад быў ахутаны дымам і зарывам...

Але памятаю я і другое: як высока ўзнялася рэвалюцыйная хваля ў маім горадзе ў дні Кастрычніка, як гераічна адстойваў мінскі рабочы клас справу рэвалюцыі, справу Леніна, абвясціўшы Савецкую ўладу літаральна праз некалькі гадзін пасля таго, як перамагла яна ў Петраградзе. Мой горад можа ганарыцца, што першымі яго кіраўнікамі ў першыя гады пасля абвяшчэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі былі Фрунзе і Мяснікоў, Адамовіч і Жылуновіч, Чарвякоў і Кнорын, Галадзед і Гамарнік і многія, многія іншыя, чые імёны ўпісаны чырвонымі літарамі ў летапіс майго горада, як і тыя безыменныя, што пааддавалі свае жыцці за шчасце людзей майго горада, маёй рэспублікі...

II

Мой горад! Суровай і строгай твая
прыгажосць
Стваралася ў дні, калі памяць вайны
не астыла.
І камень твой кожны любоў сагравала,
не злосць
І сонца Наступнага з кожнае шыбы свяціла...

МОЙ РОДНЫ ГОРАД! На маіх вачах змяняў ты сваё аблічча. Абноўлены, памаладзелы, авеяны вятрамі Кастрычніка, ізноў падняў ты сваю гордую галаву, назаўсёды стаўшы сталіцаю Беларускай Дзяржавы! Ізноў, у каторы раз, загаіў ты свае раны, адбудаваў спаленыя акупантамі дамы і кварталы, узарваныя масты і заводы, вакзалы і чыгуначныя дэпо! Пятнаццацігадовым камсамольцам хадзіў я на суботнікі, быў чонаўцам, разам з мулярскай арцеллю адбудоўваў свой горад, добра засвоіўшы бацькаву прафесію.

Я памятаю, як перамагаючы разруху і голад, рабочыя горада наладжвалі працу заводаў і фабрык, як бурна і імкліва адбудоўваўся горад, як з'явіўся ў ім першы за ўсю яго гісторыю універсітэт, першы прафесійны тэатр, як весела і звонка па яго старажытных вуліцах загрымеў першы ў яго жыцці трамвай...

А горад усё рос, сталеў, мужнеў... На былой Захараўскай вуліцы, дзе некалі тулілася цэрквачка слепых, паміж новым касцёлам і чыгуначнай царквой, узняліся са шкла і бетону велічныя муры Дома ўрада, як сімвал беларускай дзяржаўнасці, яе непарушнасці і магутнасці... А на былой Траецкай гары, дзе спрадвеку наладжваліся гаманкія і шматлюдныя кірмашы, узняўся, як велічны храм мастацтва, будынак першага ў Беларусі опернага тэатра...

Горад харашэў. Нібы вырваўшыся з палону вузкіх вуліц драўляных ускраін, перасягнуўшы мост праз Свіслач, перасягнуўшы славутую Камароўку, ён вырваўся на шырокі прастор насустрач братняй Маскве. Там пачалі расці новыя будынкі: Дом друку, клінічны гарадок, Акадэмія навук, і лепшая ў краіне аўтастрада, прамая, як напятая струна, звязала навекі сэрцы дзвюх сталіц... А тым часам у цішыні праектных майстэрань і інстытутаў нараджаўся генеральны план рэканструкцыі горада, намячаліся контуры яго захапляючай будучыні...

Незабыўныя трыццатыя гады! Гады першых пяцігодак, гады наступу сацыялізму на ўсіх франтах: у горадзе і вёсцы, у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, у ліквідацыі непісьменнасці і бурным росце нацыянальнай культуры! З кожным днём, дзякуючы намаганням партыі і ўрада, дзякуючы самаадданай працы савецкіх людзей, змянялася аблічча Мінска.

Ён рабіўся буйным цэнтрам палітычнага і культурнага жыцця рэспублікі, ён набываў сапраўды сталічны выгляд. Горадам культуры і навукі называлі ўжо тады Мінск. Дзесяць вышэйшых навучальных устаноў, Акадэмія навук, звыш дзесятка тэатраў, кансерваторыя, філармонія, карцінная галерэя, творчыя саюзы пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, кінастудыя, выдавецтва, дзесяткі бібліятэк, клубаў, дамоў культуры...

Разам з ростам майго горада расла і маладая савецкая інтэлігенцыя, у тым ліку і нацыянальная мастацкая інтэлігенцыя, да якой ужо належаў і я. Бурная творчая і грамадская дзейнасць аб'яднання «Маладняк», у якой я прымаў самы актыўны ўдзел пачынаючы з 1925 года, вучоба ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, першыя кніжкі, першыя поспехі і няўдачы, першае прызнанне чытача і ўсведамленне сваёй адказнасці перад часам, перад грамадствам, перад будучыняй — усе гэтыя этапы майго жыцця непарыўна звязаны з жыццём майго горада, з яго развіццём і ростам. Тэма майго роднага горада, можа, падчас непрыкметна для мяне самога, чырвонай ніткай праходзіць праз усё, створанае мною да апошніх дзён, яна прысутнічае у дзесятках маіх вершаў, у паэмах, радкамі глыбокага пачуцця і непадробнай любві...

III

Мой горад! Паклаўшы на сэрца руку, я скажу:
Памножыўшы веру і мужнасць на гарт і адвагу,
Ніхто з нас не кляўся ні кнігам святым,
ні крыжу,
Каб вернасць табе захаваць, як пад сцягам
прысягу!
Праз бедствы ваеннай разлукі з нас кожны
пранёс
Нязменнасць пачуццяў, высокай любові
гарэнне.
Каб шчасцем вяртання, як токам працятым
наскрозь
Шчакою прыпасці да цёплых ад сонца
каменняў...

НОВАЕ ВЫПРАБАВАННЕ, можа быць, самае цяжкае за ўсю гісторыю яго існавання, спасцігла мой горад, калі хлынулі фашысцкія орды на савецкую зямлю. Але не скарыўся перад заклятым ворагам мой горды горад. Ні кроў, ні смерць не спынілі барацьбітоў яго. Сцякаючы крывёю, ён змагаўся з акупантамі. Тысячы вядомых і невядомых герояў ахвяравалі сваім жыццём, але горад выстаяў, паказаўшы бяспрыкладны ў гісторыі народа подзвіг, мужнасць, волю да перамогі, адданасць справе партыі камуністаў, ідэалам будучыні...

Так стаў мой горад горадам-героем! Горадам-арднаносцам.

Прайдзіце ў святочныя дні па новаму, адроджанаму гораду, беларускай сталіцы, па алеі герояў. Глыбокі жаль і законная гордасць перапоўніць вашыя сэрцы; пачуццё глыбокай удзячнасці тым, хто аддаў сваё маладое жыццё ў імя будучыні, нахлыне ў вашыя душы... І вялікая гордасць за свой мужны народ, за яго ратны і працоўны гераізм, абудзіць вашу волю да новых здзяйсненняў, да новых вышынь.

Мой дружа сучаснік! Над табою ярка свеціць сонца, над табою зіхаціць сваёю чысцінёю мірнае блакітнае неба. Гэта — шчасце! У тым небе пралятаюць цудоўныя караблі — срабрыстыя лайнеры. А яшчэ вышэй над імі, за межамі бачнасці, робяць чарговыя віткі вакол планеты касмічныя караблі... Там частачка і тваёй працы і тваіх бацькоў і дзядоў, і тых, хто аддаў сваё жыццё за тое, каб чыстым было неба над нашымі галовамі, каб ліло яно сонечныя праменні і празрысты блакіт на мой і твой родны горад, каб вечна жыло хараство зямное і хараство творчай неўміручай энергіі чалавека савецкай зямлі, чалавека цудоўнай нашай эпохі і яшчэ больш цудоўнай і шчаслівай будучыні...

Светлым і радасным уяўляецца нам усім заўтрашні дзень нашага горада. У цішыні шматлікіх праектных інстытутаў ізноў нараджаюцца грандыёзныя праекты будучага Мінска. І гэта не мары. Гэта—рэальнасць заўтрашняга дня. Вышынныя дамы, прамыя шырокія праспекты, гарады-спадарожнікі, блакітныя азёры вакол сталіцы, зялёныя зоны паркаў, новыя стадыёны і спартыўныя збудаванні, дзіцячыя сады, тэатры і, нарэшце, светлыя вестыбюлі Мінскага метрапалітэна!.. І ва ўсім гэтым — прыгажосць!

Такім уяўляецца нам заўтрашні горад Мінск, адроджаны з руін і попелу працавітымі рукамі яго сыноў. І над усім гэтым дамінуе яго галоўная магістраль — Ленінскі праспект, які здзіўляе сваім хараством, шырынёю, святлом, зелянінай дрэў, і ў пачатку якога, як сімвал удзячнасці народнай, узвышаецца помнік-манумент вялікаму правадыру Уладзіміру Ільічу Леніну. Азораныя яго бессмяротнымі ідэямі, акрыленыя воляю Камуністычнай партыі, смела глядзяць у будучыню слаўныя мінчане!

Алесь ЗВОНАК.

Белая вея снежня

Снег церусіў усю ноч. І зараз, раніцай, па ашэрхлай падмёрзлай зямлі сваволька гойсала вея, блыталася пад нагамі, арфавала незляжалы снег ля платоў. Твары прахожых свяціліся радасным здзіўленнем зіме, якое было падмацавана тым, што вось, урэшце, снежань бярэ сваё — і маленькія далонькі дзяцей спрабавалі ляпіць першыя снежкі.

А снег сыпнуў зноў. Яго вітала звонкагалосая дзіцячая радасць.

На ганку школы Сяргей Фёдаравіч спыніўся. Раптам тут, на школьным ганку, узвілося над ім белае крыло снежня выразна бачным прывідам апошняй, растайнай пары чалавечага жыцця.

Што ўбачна, што пачута, што апазнана ў гэтым снезе?

Яму падумалася, што вось так праз усё жыццё, па ўсіх дарогах, ішоў і шоў за яго плячамі снег, замятаў след. Зноў нечакана ўбачылася ваенная Ладага: чорная, у чатыры каляіны, дарога жыцця... І снег, снег над ёй. Але чаму ж тады не замецена ў памяці яна, чаму праз безліч зім дагнала, захмарыла яго шчырую радасць, павяла зноў крок за крокам? Чаму згадаў яе, калі чытаў у ранішняй «Правде», што яго ўчарашняму выпускніку, генеральнаму дырэктару аднаго з ленінградскіх заводаў — Колю Камяку — прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР? Харошая, прыемная навіна, а глядзі ты, як балюча, трывожна азвалася ў ім. І свой даўкі боль Сяргей Фёдаравіч прыняўся лячыць спадзяваннем, што там, на зыходзінах, скажа ўпэўнена, не пакрывіць душой — жыццё сумленна пражыта.

За дзвярамі, бы гаворачы сабе — мы яшчэ папрацуем, Сяргей Фёдаравіч зірнуў на школьную Дошку гонару. Сур'ёзныя твары выдатнікаў — ведаў, іх 156! — сказалі яго думкам тое ж.

Неяк бадзёра, больш натхнёна тлумачыў сваю матэматыку. Не зачыняўся аціхла ў дырэктарскім кабінеце ў час перапынкаў і фортачак, правёў іх у настаўніцкай, адкінуў іншыя незлічоныя справы. А дома, вечарам, схаваўшыся падалей ад жончыных вачэй, засеў за пісьмовы стол.

— Вячэраць ідзі, дысертант,— знайшла ўсё-такі, падступілася жонка. — Хоць бы на старасці пра здароўе падбаў, — выказала сваю вечную незадаволенасць.

— А ведаеш, Валя, — іх вочы сустрэліся ў «паядынку», — пашкадаваў сёння, што раней не ўзяўся за доктарскую.

Валянціна Лукінічна моўчкі ківала галавой. Яна, як і многа разоў некалі, прынесла Сяргею Фёдаравічу чай у кабінет. Потым яны доўга гаварылі. У гэты вечар было ім надзвычай утульна ў сваёй апусцелай кватэры, якую пакінулі дзеці — выйшлі ў людзі, і якую толькі па леце ажыўлялі звонкія галасы ўнукаў.

Доўга-доўга стукалася ў ледзяное шкло рамы белае крыло снежня.

Гэты снежань нястрымна віхурыў у памяці Сяргея Фёдаравіча, і яна выхоплівала нешта большае за эпізоды з яго жыцця; адмаўляючы звычайную іх канстатацыю, давала ім вялікі грамадзянска-значымы сэнс.

Такі ход думкам даваў сам час — сонечны, мірны, радасны. Людзі, згаладалыя не раз, па-харошаму звыкліся з тым, што на стале ўдосталь хлеба. І ў яго дзверы стукаецца іхняе шчасце, пудкай дзіцячай чародкай выстройваецца штоверасень перад вокнамі школы, і ён азірае сваіх новых вучняў, строгі і прыдзірлівы, бачыць, што мо і залішне песціць іх бацькоўская любоў.

Зараз усю яго ранейшую прыдзірлівасць студзіла нечакана прыйшоўшая думка, што не надта ўжо ім, бацькам, выпадала ў жыцці песціць сваіх неслухаў. Апратка дзяцей, тое, як мяняецца яна ў бок чалавечай раскошы, гаварыла яго думкам адно: людзі аддыхаліся ад нястач і шчодра адорваюць дзяцей тым, чаго самі не мелі.

«Занадта ўжо цяжкія дзеці...» — Сяргей Фёдаравіч не быў прыхільнікам гэтых трывожных вывадаў сваіх калег, якія даволі часта прыходзілася чуць на розных салідных нарадах. І ў вечных дэбатах пра сённяшняе школьнае пакаленне заставаўся заўжды пры сваім: наша бяда, нашы пралікі...

Нялёгкая іх прафесія—акрыляць чалавечы розум. І зараз, калі думалася пра вучняў, як пра наступнікаў, якім тарыць заўтра недаходжаныя ім сцежкі, горача завірыла ў сэрцы перакананне ў праваце яго строгай, прынцыповай дырэктарскай маладосці, якую — усе трыццаць дырэктарскіх год — аддаў фарміраванню настаўніцкага калектыву. І недзе глыбока ў душы чуў апраўданне сваёй строгасці і прынцыповасці: многім, выпадковым настаўнікам, не даў магчымасці прыстасавацца, прыжыцца за кошт другіх. І ў гэтым (чуў як перакананне) увесь сакрэт педагагічнай дужасці яго школы, выток яе шматгадовай рэспубліканскай славы.

Сяргею Фёдаравічу лёгка дыхалася ў гэтых віхурных завеях снежня. Лёгка, па-маладому бадзёра, працавалася. Ды ўсё ж, раз-пораз, недзе глыбока ў душы абуджалася і складанае, супярэчлівае. Аднак быў пераможцам і ў наступе гэтых скрушных думак. Усё адно як з нейкай гары азіраў абсягі свайго жыцця, стаяў высока над ім.

Не, тут і толькі тут яго месца. Сярод гэтых людзей, дзяцей іхніх, якія і ў наступным верасні прыйдуць на ягоны парог. І хай многім думаецца, што вучоныя ўсе—па сталіцах сядзяць, што, значыць, ён ужо і не такі там вучоны, а ён да астатку адлічаных дзён будзе тэпаць з кучай сшыткаў пад пахай у сваю школу. І што такое яго дысертацыя?

Упершыню адказаў сабе самому: гэта школа, дзеці, жыццё...

На Случчыну, да людзей, поплеч з якімі пражыта-пройдзена столькі, ён, Рубанаў, атрымаў накіраванне Мсціслаўскага педагагічнага тэхнікума. За плячамі Сяргея Фёдаравіча — тады яшчэ бязвусага юнака — быў ужо стаж настаўніцкай работы. Пачаў настаўнічаць з шаснаццаці год. Адразу ж пасля заканчэння Лядаўскай сямігодкі, дзе праявіў асабліва вялікія здольнасці ў матэматыцы, уладкаваўся на працу ў школу для малапісьменных у сваім Дубровенскім раёне, дзяліўся набытымі ведамі з пераросткамі і дзядзькамі, якія пажадалі асіліць грамату.

І сёння, праз веі снежня, неяк іначай, цяплей і выразней, бачылася Сяргею Фёдаравічу яго юнацтва. Блукаючы там далёка, у яго абсягах, праз сваё ўласнае, здавалася б, дробязнае, раскрываўся яму характар часу, пакалення. Зноў як бы адчуў у сэрцы хвалю таго маладога рамантычнага ўздыму, якая панесла іх, дзяцей цёмнае вёскі, па жыцці.

Згадаўся бацька... Першая дзіцячая сустрэча з ім, якая асела ў памяці на гады. І гэты дзень, гэты сонечны прыпамін, стаўся яму зараз зыходным для адліку ўсёй памяці.

Яны, малыя, цікавалі з-за плоту, як ішлі і ішлі па вёсцы незнаёмыя, чужыя дзядзькі. А потым адзін з іхняга гурту збочыў да іх, і ўжо на двары гэты дзядзька ў выцвілай салдацкай гімнасцёрцы, падхапіў на рукі яго, напалоханага і разгубленага, стаў калоць чорнай, як смоль, барадой. З гароду, з-за гумна, бегла маці. Яна са слязамі абвіла шыю незнаёмаму дзядзьку, і потым, азірнуўшы іх, быццам стала апраўдвацца перад большымі за гэты свой бессаромны ўчынак, лямантавала праз слёзы:

— Ды гэта ж, дзеткі, бацька ваш... бацька...

Згадаў, як утульна яму, малому, сядзелася на бацькавых каленях, калі на прызбе частаваў бацька суседскіх дзядоў салдацкай махоркай, расказваў ім пра вялікія змены ў свеце, пра Леніна, пра тое, што цяпер зямля іхняя, мужыцкая. Вочы дзядоў свяціліся шчаслівай радасцю. А бацькавы рукі моцна сцялі яго плечы. І сёння, праз такія далячыні гадоў, Сяргей Фёдаравіч выразна пазнаў у памяці жывы бацькаў голас:

— Вось, вось для каго мы шчасце здабылі!..

Зараз, калі згадвалася ўсё гэта, ён спрабаваў адказаць: якое ўсё-такі ягонае шчасце. Дый ці было яно ўвогуле, калі можна ім, шчасцем, іменаваць тое, што пахне порахам?

Толькі абзавёўся сям'ёй, як грымнула ліхалецце, паставіла ў салдацкі строй. Пайшоў на вайну, прыхапіўшы з сабой падручнік матэматыкі. А потым, праз вогненныя гады, пасля шпіталю, ехаў у толькі што вызвалены Слуцк, каб дазнацца, што са сваімі, і, магчыма, упершыню, тулячы іх, жывых, згадаў і сам вось гэтую першую сустрэчу з бацькам. Сыны, якія не памяталі яго зусім, адарылі шчаслівай радасцю і даверам, паверылі, як і ён сам некалі, слёзным матчыным словам, што гэта іх бацька, бо хто з іх, жагнутых горам, не чакаў свайго бацьку.

І ён вярнуўся да іх праз год з Перамогай. Частаваў хлапчукоў сэканомленым салдацкім цукрам, гладзіў іх кудлатыя чубы, глядзеў у ціхмяныя, падаросламу сур'ёзныя вочы.

Адкуль толькі браліся сілы?..

На агледзінах сваіх пасляваенных дарог адкрываў Сяргей Фёдаравіч, што ў нялёгкі для краіны час у людзях яго пакалення бунтоўна вірыла прага да ведаў, іх абарваная, няздзейсненая мара, і яны не саромеліся ў сваім салідным узросце стукацца ў дзверы вышэйшых навучальных устаноў. Знаходзілі час для вучобы. Ён і сам адразу ж пасля Перамогі стаў студэнтам-завочнікам Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна, карпеў па вечарах над практычнымі заданнямі, насіў іх на пошту, дасылаў у Маскву, двойчы на год выязджаў на студэнцкія сесіі. А пасля заканчэння інстытута, адразу ж у сорак восьмым, стаў дырэктарам школы ў Слуцку.

Гэтая пасада зрабіла яго другім бацькам для тых, хто не дачакаўся сваіх бацькоў. І ён сагураваў іх дабрынёй, шкадаваў, як сваіх уласных, дапамагаў, чым толькі мог, выстаяць у паядынку з жыццём. І, як педагог, па-харошаму радаваўся іх ранняй сталасці, таму, як ціхмяна, удумліва, яны, пераросткі, заселі за падручнікі.

У гэтым гурце прамчала босае, не заўсёды дагледжанае маленства яго старэйшых. Былі прыкладам у вучобе для іншых, скончылі школу медалістамі, адразу ж паступілі на фізічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна. Вучыліся так, што ніхто не ўпікнуў пры выпадку бацьку, што іх медалі — яго, дырэктарская заслуга. У час іх студэнцтва была студэнткай-завочніцай і маці, паралельна з сынамі канчала філалагічны.

А калі сыны вывучыліся, кандыдатамі навук сталі, ёкнула, зашчымела сваім нязбытным бацькава сэрца. Што было? — харошая зайздрасць да дзяцей, зайздрасць да іхняй маладосці, дарогі якой праставалі інакш. Менавіта тады захацелася не ўтаіць, не панесці з сабой тыя росчыркі на старонках многіх асіленых за век кніг, тыя спешныя запісы на лістках шматлікіх блакнотаў і звычайных сшыткаў у клетку, тыя думкі, што мітуслівым роем агарнулі ў бяссонных. І ён, як бы прыспешаны маладосцю сыноў, засеў усур'ёз за сваю дысертацыю. Не адзін чарговы адпачынак правёў у бібліятэках Масквы.

Дык які ж ён вучоны, калі сядзіць тут, у Слуцку?.. І гэтая даўняя крыўда зараз, у веях снежня, не раніла, а наадварот, цешыла яго. Цешыла тым, што вось ён, звычайны настаўнік, унёс свой уклад у любімую змалку навуку — геаметрыю, стаў кандыдатам, Героем Сацыялістычнай Працы. Цешыла тое, што яго старэйшыя сыны — дактары, а меншы Анатоль, як і ён,—кандыдат.

Хто? Хто ў іх Рубанаўскім родзе хадзіў калі-небудзь у вучоных?

Хораша, лёгка было на сэрцы ад думак пра час, пра народ.

Снежань віхурыў...

Мікола МЯТЛІЦКІ.

ЗЯМЛІ НАШАЙ КРОКІ ІМКЛІВЫЯ

Заняткі ў гуртку лікбеза ў адной з вёсак Гомельшчыны. 1929 год.
У аўдыторыі сінхроннага перакладу Мінскага педагагічнага інстытута замежных моў.

ПЕСНЯ З ДЗЯЛЯЦІЧАЎ

ГЭТА ж як бывае: у Дзяляцічах спрадвеку хораша спяваюць, а ў суседніх Загор'і, Хорашаве ды Ходасах песню не тое каб не любілі, але ставяцца да яе спакойна. А людзі такія самыя, і Нёман плыве міма той самы, і зямля родзіць аднолькава.

Што за дзіва?

«Ды проста завядзёнка такая ў нас»,—гавораць дзяляціцкія дзяды. «Традыцыя», — тлумачыць па-сучаснаму моладзь. Але гэтай завядзёнцы ці традыцыі нехта ж паклаў пачатак? Каму першаму той усплёск нёманскай хвалі выліўся песняй? Мо гэта быў хто з Клімовічаў—самае распаўсюджанае ў Дзяляцічах прозвішча, а мо з Трубкаў — і такія тут жывуць, ці з Мамчыцаў?

А калі?

— А, мабыць, яшчэ за царом Гарохам, — усміхаецца самы старэйшы ўдзельнік Дзяляціцкай народнай харавой капэлы, які спявае ў ёй з дня яе нараджэння ў 1926 годзе, сямідзесяцідвухгадовы Іван Ільіч Клімовіч. — Ведаю толькі, што і бацька, і дзед мой процьму песень ведалі. Тут у нас, таварыш карэспандэнт, даўней, за панскім яшчэ часам, плыты па Нёману сплаўлялі. Амаль усе дзяляціцкія мужыкі плытагонамі наймаліся. Пад вечар як пасядзема ля вогнішча, як зацягнем песню, дык, дальбог, людзі з бліжэйшых вёсак прыходзілі слухаць. Так і гаварылі вяскоўцы паміж сабой: «Пойдзема, там дзяляціцкія спяваюць». Во, як!

Стары апускае галаву, нешта ўспамінае, потым моцным яшчэ голасам пяе:

Колькі раз рыбацкі човен
На грудзях тваіх гуляў,
Ой ты Нёман, родны Нёман,
Колькі дум ты мне награў...

— Вось такую, значыць, спявалі мы песню, — гаворыць стары Клімовіч. — Ды хіба толькі гэту?

Ідзе наша нетаропкая бяседа ва ўтульным кабінеце дырэктара Дзяляціцкага сельскага Дома культуры Лідзіі Васільеўны Бушмы, якая яшчэ і салістка капэлы, прыйшлі сюды таксама мастацкі кіраўнік капэлы Марыя Іванаўна Дароніна, удзельнікі яе—Іван Мамчыц і Вольга Клімовіч — палявод і даярка, ды настаўніца Леаніла Макарэвіч.

Марыя Іванаўна ўжо дванаццаць гадоў кіруе капэлай. Яна сама дзяляціцкая, праўда, цяпер жыве ў Навагрудку, выкладае там у музычнай школе. Але тут, у вёсцы, яе карэнні — бацька Іван Іванавіч Трубка і маці Ганна Сцяпанаўна, ну і вяскоўцы, на чыіх вачах вырасла.

Два разы на тыдзень, а перад адказнымі выступленнямі і часцей, прыязджае Марыя Іванаўна за трыццаць кіламетраў на рэпетыцыі. Тут, у Доме культуры, яе чакаюць сорак спевакоў.

Вось так некалі сярод іх стаяла і яна, школьніца. Спявала ў капэле разам з бацькам і маці. Бацькам Маша ганарылася асабліва. Сярод спевакоў ён быў спявак, ды яшчэ выдатна іграў (чаму — іграў, і цяпер іграе) і на гітары, і на балалайцы...

Калі скончыла Маша восем класаў, тагачасны кіраўнік капэлы Панцеляймон Аляксандравіч Радаміцкі павёз яе ды дзвюх сяброўак Ніну Хількевіч і Любу Хацяновіч у Гродзенскае музычнае вучылішча. Падтрымаў іх там сваім аўтарытэтам вядомага хормайстра. Сказаў кіраўнікам: «Дзяўчаты музычнай адукацыі не маюць, але не без таленту, і песню любяць як ніхто».

Дзень і ноч рыхтаваліся да экзаменаў. Прынялі.

Люба Хацяновіч (па мужу Кулакоўская) цяпер кіруе народным хорам у Ваўкавыску.

Сама Марыя Іванаўна, калі прапанавалі ёй узначаліць дзяляціцкі хор, спачатку нават спалохалася. Пасля Радаміцкага два ці тры гады калектыў быў без кіраўніка. Праўда, некалькі чалавек прыязджала па накіраванні, ды хуценька знікалі назусім. Чаму? Не падабаліся харыстам.

— Тут, у Дзяляцічах, — усміхаецца Дароніна,— у песні кожны сам сабе прафесар.

Ну, а яе прынялі. Па-першае, свая, па-другое, ведае, як спяваюць тут, не стане ламаць, круціць, як той-сёй да яе...

— Ай, нешта сядзім мы ды ўсё гаворым, гаворым, — ускліквае Вольга Клімовіч.—Аж у горле перасохла. Маша, Ліда, давайце зацягнем якую...

— А якую? — пытаецца Марыя Іванаўна.

— А хоць бы гэтую: «Туман—ярам...»

«Туман — ярам, ярам — даліною. За туманам нічога не відна», — зацягвае Дароніна чыстым прыгожым сапрана. «Толькі відна дуба зелянога»—падхопліваюць жанчыны, ды кожная па-свойму, ды кожная дае песні сваю адметную фарбу. «Пад тым дубам крыніца стаяла», — выводзіць Марыя Іванаўна, «З той крыніцы дзеўка ваду брала», — уплятаюць свае галасы Клімовіч і Бушма.

— Ой, хораша гэтую песню маці мая спявала, — уздыхае Вольга Канстанцінаўна.

— А я помню, — кажа стары Клімовіч.

Ён многае помніць. Як у далёкім дваццаць шостым сабраліся на першую спеўку. Вырашылі паспаборнічаць з царкоўным хорам, які славіўся на ўсю акругу. Спявалі не толькі народныя беларускія, а і рэвалюцыйныя, тую ж «Варшавянку», «Смело, товарищи, в ногу»... З канцэртамі, вядома, не ездзілі, не мелі такой завядзёнкі, ды і небяспечна было, — нават за выкананне народнай песні можна было схапіць штраф. Ну, а за рэвалюцыйную і казаць няма чаго... Таму на тыя спевы сыходзілася мала не ўся вёска. Збіраліся ў пажарным дэпо. Тут жа гурткоўцы і п'есы ставілі забароненыя: «Апошняе спатканне», «Раскіданае гняздо», «Мікітаў лапаць», славутую «Паўлінку»...

У трыццаць дзевятым, калі ўсталявалася Савецкая ўлада, перайшлі харысты ў памяшканне школы. Тут ужо — разгарнуліся!..

Ды неўзабаве грымнула вайна, апусцілася на родную зямлю чорная хмара. Не да песень стала. З мясцовых мужчын хто на фронт пайшоў, хто ў партызаны... Пасля вайны, як ні цяжка было, а песня ажыла. Кіраваць калектывам тады ўзяўся Мацвей Клімовіч, таксама з мясцовых, чалавек, апантаны песняй.

Успамінаюць у Дзяляцічах, як у 1948 годзе хор запрасілі на агляд у Баранавічы (там быў тады абласны цэнтр). Па ўсёй вёсцы збіралі для харыстаў—было іх васемнаццаць—белыя кофтачкі і чорныя спадніцы для жанчын і белыя сарочкі для мужчын.

Так здарылася, што калектыў трохі спазніўся, амаль усе ўдзельнікі ўжо выступілі, і журы, натуральна, моцна стаміласа. Калі дзяляціцкія харысты з'явіліся на сцэне, нехта з журы прапанаваў: «А мо хопіць ужо, вунь колькі праслухалі?»

Ды тут узмаліўся Мацвей Клімовіч: — «Мы ж, кажа, за дзевяноста кіламетраў ехалі, і ні з чым вернемся... Ну хоць адну песню нашу паслухайце».

І заспявалі. Адну песню праспявалі — маўчаць члены журы. Падмігнуў Мацвей: маўляў, давайце яшчэ. Яшчэ адну выканалі. І тут выбягае старшыня таго журы на сцэну, пачынае цалаваць выканаўцаў і паўтараць.: «Ну, малайцы, ну, узрадавалі. Салаўі дый годзе». Быў гэта Генадзь Іванавіч Цітовіч.

З таго дня і завязалася ў дзяляціцкага калектыву моцная дружба з Цітовічам. Славуты хормайстар на працягу некалькіх гадоў рэгулярна наязджаў у Дзяляцічы, кіраваў калектывам. Бо таленты талентамі, але калі рабіць усё пасапраўднаму, дык тут абавязкова спецыяліст патрэбны — і каб лад быў, і галасы былі пастаўлены, зноў жа — кожную песню трэба на галасы распісаць. А рэпертуар? Акрамя фальклорных народных песень, развучылі харысты нямала сучасных твораў і беларускіх, і рускіх, і ўкраінскіх кампазітараў.

Пасля пяць гадоў мастацкім кіраўніком калектыву быў Панцеляймон Аляксандравіч Радаміцкі — вопытны, таленавіты хормайстар. Пры Радаміцкім калектыў атрымаў званне народнага і статут капэлы. А гаворыць гэта пра тое, што большасць твораў калектыў выконвае акапэльна, г. зн. без суправаджэння. Складаная манера выканання, якая пад сілу толькі вопытным спевакам.

— Спявае наша капэла і на чатыры, і нават на шэсць галасоў, — расказвае Марыя Іванаўна. — Гэта надае выкананню поліфанічнасць, асаблівую музычнасць.

Сёння ў рэпертуары капэлы больш як сто твораў. Гэта пераважна народныя песні — і лірычныя, і жартоўныя, такія, скажам, як «Ці не быстра рэчка ваду замуціла», «Ой, не кукуй, зязюленька», «Стаіць гара высокая», «Рабіна, рабіначка», сучасныя песні беларускіх кампазітараў «Нёман», «Люблю наш край» і г. д.

А на які шырокі прастор вырвалася дзяляціцкае мастацтва! Два разы капэла гастралявала ў Польскай Народнай Рэспубліцы, выступала ў Літве, у Маскве на ВДНГ. Ну, а пра рэспубліку і казаць няма чаго. Толькі нядаўна дзяляціцкіх спевакоў запісвалі ў Гродне на абласным тэлебачанні. Выступалі яны ў іншых гарадах Беларусі. Капэла — лаўрэат Першага Усесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці працоўных, узнагароджана вялікім залатым медалём, а кожны з яго ўдзельнікаў — малым залатым медалём. Сярод лепшых з лепшых капэла прымала ўдзел ва ўрачыстым заключным канцэрце фестывалю, які адбыўся ў Мінску ў Палацы спорту.

Але мне не хацелася б, каб у чытача гэтых нататак склалася ўражанне, што дзяляціцкая капэла — гэта нейкая выключная з'ява ў культурным жыцці вёскі. Не, яна дакладна ўпісваецца ў сённяшні дзень, у сённяшнюю яву. Рэпеціруюць і выступаюць харысты ў выдатным сельскім Доме культуры, дзе і вялікая зала на 400 месцаў, і танцавальная зала, і пакоі для гурткавай работы. А на тэрыторыі саўгаса, куды нядаўна ўвайшлі Дзяляцічы (раней тут быў калгас), яшчэ чатыры сельскія клубы, ды некалькі бібліятэк, ды адна сярэдняя, адна васьмігадовая і дзве пачатковыя школы, гандлёвы цэнтр, участковая бальніца. Параўнаўча нядаўна гэты куток Навагрудчыны лічыўся самай што ні ёсць глыбінкай — ад райцэнтра 30 кіламетраў. Сёння ў гэтую «глыбінку» прыязджаюць замежныя госці. Вось і сёлета тут на мемарыяльным комплексе «Партызанская стаянка» і ў музеі партызанскай славы пабывала вялікая група замежнай моладзі.

І яшчэ мне хочацца расказаць пра адзін маленькі эпізод. Калі ўжо развітваліся мы з гасцінныемі гаспадарамі, дырэктар СДК Лідзія Бушма раптам усклікнула: «Ды вы ж не бачылі нашых новых касцюмаў». Ускочыла і, адчыніўшы вялікую шафу, беражна выцягнула адтуль шыкоўную белую сукенку з дарагога матэрыялу і памастацку вышытым нацыянальным арнаментам. Адчыніла другую шафу — там вісеі светлыя строгія мужчынскія касцюмы. І адразу ўспомніўся той нядаўні расказ, як збіралі па ўсёй вёсцы харыстам кофтачкі і сарочкі для выступлення на абласным аглядзе...

— А як жа, пабагацелі, што і казаць, пабагацелі, — гаворыць стары Клімовіч, пазіраючы на тыя касцюмы (тут у шафе вісіць і яго).

Працягам гэтых яго слоў стала наша размова з дырэктарам мясцовага саўгаса «Вераскава» Яўгенам Макаравічам Малухам. Дырэктар ёсць дырэктар, і перш-наперш падаў ён мне з гонарам эканамічныя звесткі. Сапраўды, гаспадарка дамаглася сёлета добрых паказчыкаў — сабрала з гектара па 31,2 цэнтнера збожжа і 189 цэнтнераў бульбы. А мяса атрымана на сто гектараў па 300 цэнтнераў. Менавіта за вытворчасць мяса саўгасу два кварталы запар сёлета прысуджаўся пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа.

— Запісалі? — пытаецца Яўген Макаравіч. — Пішыце далей: механізатары ў нас штомесяц зарабляюць па 180—200 рублёў, амаль столькі ж жывёлаводы і па 60—80 рублёў паляводы... А цяпер, — дырэктар паварочваецца да Марыі Іванаўны, якая зайшла ў кабінет разам са мной, — давайце пагаворым пра жыццё капэлы. Гэты «аб'ект» для мяне новы,— жартуе ён, — усё што трэба — дамо.

Дароніна кажа, што хоча ўключыць у калектыў некалькі жыхароў з Вераскава (гэта цэнтр саўгаса), дык трэба, каб падвозілі харыстаў на рэпетыцыю.

— Абавязкова, — дае згоду дырэктар і запісвае сабе ў блакнот. — Хто цяпер з членаў саўгаснага актыву спявае ў капэле? — пытаецца Яўген Макаравіч.

— Ну, ваш намеснік і сакратар партбюро Аляксандр Рыгоравіч Клімовіч з жонкай-бухгалтарам, брыгадзір гароднінай брыгады Міхаіл Іванавіч Шунько, — пералічвае Марыя Іванаўна, і раптам пытаецца:— А вы, Яўген Макаравіч, чаму б вам не стаць харыстам?

Дырэктар крыху бянтэжыцца, разводзіць рукамі:

— А ці падыду?

— Праверым, — адказвае Дароніна.

— Згода, — кажа дырэктар. — Скажыце, калі чарговая рэпетыцыя, абавязкова прыйду, ды таго-сяго з сабой прывяду, тут у нас ёсць такія, скажу вам, галасы.

...У старога Клімовіча два сыны. Адзін скончыў медінстытут і зараз працуе ўрачом у Мардовіі, другі — матрос далёкага плавання.

— Нядаўна ў Алжыры пабываў, — кажа Іван Ільіч і, усміхаючыся, дадае: — Ведаеце, як прыязджаў Міша на пабыўку, дык расказваў, што там, у моры-акіяне, спяваюць матросы свае родныя песні. Дык ён навучыў таварышаў нашым, беларускім, што нуў дома...

Вось так далёка паляцела песня з Дзяляцічаў.

М. ЗАМСКІ.

НАМ ПІШУЦЬ

ПЯВУЧЫ «ДЫСК»

«Сёння з кінаафіш ужо не глядзяць буйныя пунсовыя літары: «Дыск», — піша наша чытачка з г. Іркуцка Вольга Чакмарова. Але чаму ж не ўзяцца за пяро, калі ўражанні дагэтуль захавалі свежасць? В. Чакмарова — сталая прыхільніца беларускіх «Песняроў», за творчасцю ансамбля сур'ёзна сочыць вось ужо 6 гадоў. Гэта—частка яе нататак, дасланых у «ЛіМ».

Усяго паўгадзіны доўжыцца гэтая стужка творчага аб'яднання камедыйных і музычных фільмаў, але якой паўгадзіны!

...Барвовы шар асляпляе, і зараз жа ўзрываюцца апладысменты. Ад усмешак стала святлей. «Песняры»... У апаратнай студыі фірмы «Мелодыя» сабраліся яны на запіс трэцяга вялікага дыска. На чарзе — дубль першы пахмутаўскай «Беларусі». «Белый аист летит...» Даверліва і нягучна расказвае саліст Леанід Барткевіч пра сваю зямлю. Усяго тры куплеты, а ў іх гісторыя, боль і радасць Беларусі... Скупая ацэнка гукааператара: «Для пачатку нядрэнна...» Але твар яго задаволены: выкананне бездакорнае.

А далей — голас таго ж саліста кранальна, з лёгкім сумам расказвае пра каханне Явара і Каліны. Вершы Янкі Купалы арганічна спляліся з музыкай Юрыя Семянякі, але спатрэбілася майстэрства «Песняроў», каб так усхваляваць слухацкае сэрца. А вось і «Волагда». Уважліва слухаюць пахлапечы заўзяты спеў Анатоля Кашапарава дзяўчаты — лабаранткі студыі. Нават вочы пасвятлелі: такой дабратой праменіць песня! Нарэшце, «Ой, рана на Івана». З гэтым народным шэдэўрам «Песняры» выступалі і ў Амерыцы, і пераборлівая публіка адразу яго прыняла, хоць спачатку мільгала на старонках амерыканскіх газет насцярожанае: «Рускі рок на амерыканскім фронце?»

У кінакадрах адлюстраваны ўвесь працэс падрыхтоўкі грампласцінкі. Нават да супервокладкі. Але на развітанне прагучыць яшчэ да болю знаёмы, далікатна «ўбраны ў адзенне інструментоўкі» напеў «Александрыны». І мы бачым перапоўненую, зачараваную залу. «Александрына»...

Калейдаскоп кадраў, мелодый; зіхатлівыя вочы артыстаў. Экран гасне. Усяго паўгадзіны...

В. ЧАКМАРОВА.

Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР імя Р. Шырмы.

Дзяржаўны народны хор БССР.

ЗА ПЕРШЫМ СВІТАЛЬНЫМ НАПЕВАМ...

Спрадвеку поўнілася песнямі шчодрая на таленты беларуская зямля. Але марнела ў «выклятым богам» краі яго духоўнае багацце, марнела, як незнойдзены скарб. Нясмелымі парасткамі прабівалася наша нацыянальная музычная культура ў шырокі свет: са старонак нешматлікіх калісьці фальклорных зборнікаў — праз творчасць С. Манюшкі, М. Карловіча, М. Рымскага-Корсакава, М. Мусаргскага... І здаваліся недасягальнымі, у змроку людской нядолі патаналі музычныя далягляды Беларусі дакастрычніцкай.

Усё-такі непапраўна-жорстка гучыць фраза, якая няўмольна вандруе паўз сённяшнія музыказнаўчыя працы: «Да рэвалюцыі Беларусь не мела сваёй прафесійнай музыкі». Сапраўды, непапраўна. Ды толькі не скажаш: «бязвыхадна». Вось ужо шэсць дзесяцігоддзяў, як набыла сваю маладосць старажытная Белая Русь. Поплеч са старэйшым братам сваім—рускім народам — закрасавала «ў сям'і вольнай, новай». Знайшла выйсце раскутая творчая энергія беларусаў. І сёння не ахопіш ужо вокам культурныя далягляды нашай рэспублікі, і яснеюць яны ад зорак новых талентаў.

Музыка! Тут, як у адмысловым тканні з мноства стракатых нітачак сплятаецца цэласны ўзор, — з перапляцення нітачак-фактаў утвараецца карціна — толькі разглядай! А выцягнеш нітачку — застанецца яна ў руцэ, ды згіне ўзор... Больш чым паўвека стваралася тое палатно, што мы называем горда і ёмістa: «Музычная культура Савецкай Беларусі». У 20-ыя гады вядуць нітачкі-факты. Тут і адышоўшыя ў гісторыю першыя оперныя спробы М. Чуркіна — «Вызваленне працы», М. Аладава — «Тарас на Парнасе», і дасюль незабыўная, папулярная чуркінская сімфаньета «Беларускія малюнкі». Гэта і пастаўлены ў Мінскім музычным тэхнікуме «Фаўст» з Л. Александроўскай — тады яшчэ навучэнкай— у партыі Маргарыты. Гэта і пачатак бліскучага артыстычнага шляху таленавітага сялянскага юнака І. Жыновіча.

З пазнейшага — першы кампазітарскі выпуск Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, падрыхтаваны прафесарам В. Залатаровым, верным захавальнікам і прапагандыстам лепшых традыцый музычнай класікі. А. Багатыроў, П. Падкавыраў — сярод яго выхаванцаў, першыя беларускія кампазітары, якія скончылі нацыянальную кансерваторыю. А нараджэнне тэатра оперы і балета, сёлетні сезон якога ўжо 45-ы; а заснаванне Беларускай дзяржаўнай філармоніі, якая вядзе свой летапіс ужо 41-ы год!

За кожным фактам цягнецца столькі новых нітачак: імёны кампазітараў, выканаўцаў, даследчыкаў музыкі, назвы твораў, канцэртныя вандроўкі... Неўзабаве мы адзначым 40-годдзе аднаго з першых значных нацыянальных оперных твораў: «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага. Амаль жа адначасова ажыла ў святле рампы пастаноўка оперы А. Багатырова паводле Коласавай «Дрыгвы» — «У пушчах Палесся». Гэта яе прымаў з прыхільнасцю маскоўскі глядач у час першай сталічнай Дэкады беларускага мастацтва, высока ацанілі спецыялісты. Гэта праца маладога А. Багатырова была ўдастоена тады Дзяржаўнай прэміі СССР.

Ці ж мала доказаў шырокага і аўтарытэтнага выхаду беларускай музыкі з творчай лабараторыі — за межы рэспублікі!

Першыя крокі, калі адну з лепшых нашых масавых песень 30-ых гадоў—Любанаву «Бывайце здаровы!» — заспяваў славуты на ўсю краіну Л. Уцёсаў. Калі шматнацыянальная, сусветная аўдыторыя ледзьве не ўпершыню слухала беларускія напевы ў выкананні Л. Александроўскай, цымбальнага дуэта В. Бурковіча і М. Шмелькіна.

Імклівая, няспынная хада, калі сёння з арыгінальным і разнастайным нацыянальным рэпертуарам выпраўляюцца на гастролі па краіне ці за мяжу Дзяржаўны народны аркестр БССР імя І. Жыновіча, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы, маладыя «Харошкі»... «Песняры» — у Злучаных Штатах; «Купалінка» — у Балгарыі; «Верасы» — у Фінляндыі; парыжане слухаюць Т. Шымко; у Японіі вітаюць А. Астрамецкага... Гучна?!

Праз грамзапісы, па каналах эфіру, са старонак нотных выданняў шукае новых знаёмстваў музыка нашай рэспублікі. Лёгкі на пад'ём, самы таварыскі жанр — песня. І вось мы ўжо чуем: Лучанковы «Вересы» спявае Э. Хіль, а «Дударыкі» — М. Пахоменка, майстры савецкай эстрады падхопліваюць лепшыя навінкі Э. Ханка... Ды хіба ж толькі песні — у прафесійных музыкантаў паза «роднымі сценамі» заваёўваюць прызнанне беларускія сімфанічныя партытуры. Азірнешся назад хаця б на годдва — і вось не такі ўжо малы спіс: выканаўчыя калектывы Данецка, Ленінграда, Львова, Масквы, Рыгі, Ялты папоўнілі свае праграмы творамі А. Багатырова, Л. Абеліёвіча, Г. Вагнера, А. Мдзівані, Р. Суруса.

Што ж даражэй для прафесіянала-творцы: удзячнасць масавага слухача, захапленне аматара - дылетанта? Прызнанне, давер'е, што зыходзяць ад калег па мастацтву?.. Ва ўсякім разе, паўпрэды маладой кампазітарскай школы Беларусі не пазбаўлены сёння ні таго, ні другога. Наўрад ці кампетэнтны і прафесійна сумленны спецыяліст браўся б за твор, не варты ўдумлівай, карпатлівай працы. Тым больш, калі за гэтай працай — арганізацыя намаганняў вялікага і стракатага калектыву. Калі за гэтай працай — тэатр. І праверку «чужым» тэатрам таксама прайшла беларуская музыка. Опера Ю. Семянякі «Калючая ружа» — на фрунзенскай сцэне (Кіргізскі дзяржаўны тэатр оперы і балета) і ў оперным тэатры Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Балеты Я. Глебава: «Альпійская балада» — у Чэлябінску, «Выбранніца» — у Новасібірску, «Ціль Уленшпігель» — у Львове, Чэлябінску, Ленінградзе... Неяк адгукнуўся ўзрушана «ЛіМ» на канцэрт госця з Вялікабрытаніі Невіла Дзілкса, які дырыжыраваў беларускай музыкай — Другой сімфоніяй Глебава. Што ж, адметная падзея — увага замежнага дырыжора. А праз колькі год — давер'е замежнага тэатра! Балет «Ціль Уленшпігель» на хельсінскай сцэне, у пастаноўцы «Суомі-опер». Цяпер гэтай музыкай зацікавіўся берлінскі харэограф...

Вось так. Сёння ўсё часцей забываецца сумная рыска — маўклівы прочырк, што пастаўлены ў гісторыі беларускай прафесійнай музычнай творчасці мінулаю часінай. Яснеюць нашы музычныя далягляды. Досвіткам маладой кампазітарскай школы азораны новы дзень беларускай музыкі.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

Дзяржаўны народны аркестр БССР імя І. Жыновіча.

Дзяржаўны ансамбль танца БССР.

Сцэна са спектакля «Князь-возера» ў пастаноўцы Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР.

«Стварэнне свету» ў тым жа тэатры.

Фота Ул. КРУКА.

ПРА ВЕРНАГА ЛЕНІНЦА

ВЫСОКІ ЛОБ, уважлівы позірк праніклівых вачэй, невялікія чарнявыя вусікі — ва ўсім абліччы гэтага чалавека была нейкая асаблівая прывабнасць, шчырасць, прыхільнасць і дабрата. У яго асобе прыроджаная сялянская мудрасць арганічна дапаўнялася грунтоўнай асветай і шырынёю погляду на жыццё і грамадскія падзеі інтэлігента, што выйшаў з народных глыбінь. Такім ведала Аляксандра Рыгоравіча Чарвякова ў свой час уся Беларусь. Ведала як выдатнага палітычнага дзеяча, ведала проста як чалавека і камуніста ленінскай гвардыі, які ўмеў арганізаваць народ, заўсёды ішоў з народам, верна служыў народу.

Пра гэта ідзе гаворка ў цікавай і змястоўнай кнізе Уладзіміра Якутава «А. Р. Чарвякоў. Старонкі біяграфіі», што выйшла нядаўна ў выдавецтве «Беларусь». Аўтар нарыса ярка і жыва, на багатым фактычным матэрыяле паказвае нялёгкія жыццёвыя пуцявіны Чарвякова ў дарэвалюцыйны час, а таксама яго бурлівую дзейнасць вернага ленінца пасля Кастрычніка.

Беларускі хлопец з вёскі Дукорка, што на Ігуменшчыне, змалку трапіў у вялікі горад: бацька ў пошуках лепшай долі пераехаў з сям'ёй ў Вільню. Там была вучоба ў гарадскім двухкласным вучылішчы, потым праца чорнарабочым, служба пісарчуком, нялёгкі рэпетытарскі хлеб. Працалюбівы і здольны да вучобы юнак многа чытаў, займаўся самастойна і нарэшце здаў экстэрнам экзамен на званне народнага настаўніка, працаваў у пачатковай школе, а пасля вучыўся ў Віленскім настаўніцкім інстытуце. Закончыў ён вучобу ў інстытуце ў 1915 годзе, і неўзабаве пачалася ваенная муштра ў Аляксандраўскім ваенным вучылішчы (дарэчы, цікавы факт: у вучылішчы знаходзіўся тады і Якуб Колас; закончыў, праўда, ён вучылішча на месяц раней, чым А. Чарвякоў).

Лютаўскую рэвалюцыю прапаршчык Чарвякоў сустрэў у сталічным Пецярбургу, прыняў ў ёй актыўны ўдзел, а ў маі 1917 года ён, камандзір роты другога кулямётнага палка, стаў членам Камуністычнай партыі.

Прыцягваючы і ўмела выкарыстоўваючы разнастайныя звесткі і дакументальныя факты, успаміны самога Аляксандра Рыгоравіча, архіўныя матэрыялы, скупую інфармацыю тагачаснай перыёдыкі, Уладзімір Якутаў узнаўляе перад намі жывую карціну далёкіх, але незабыўных падзей першых год Савецкай улады і ўтварэння беларускай дзяржаўнасці. Усюды тут на пярэднім краі барацьбы А. Чарвякоў — палымяны прапагандыст і арганізатар народных мас.

З іменем А. Чарвякова звязана дзейнасць Беларускага нацыянальнага камісарыята — першай савецкай установы, якая займалася праблемамі беларускай дзяржаўнасці і культурна-асветнымі пытаннямі. Белнацком, першым камісарам якога быў А. Чарвякоў, наладзіў выданне кніг на актуальныя тэмы, першай беларускай савецкай газеты «Дзянніца», адкрыў Беларускі народны універсітэт у Маскве, беларускія школы, займаўся дапамогай бежанцам-беларусам.

Пазней беларускі камуніст атрымлівае прызначэнне камісарам дывізіі, працуе на адказнай пасадзе начальніка культурна-асветнага аддзела Усерасійскага бюро ваенных камісараў, восенню 1918 года ўпершыню сустракаецца з У. І. Леніным.

Далей аўтар кнігі вядзе свайго героя праз тыя памятныя падзеі, якія сталі слаўнай гісторыяй нашай рэспублікі. Знаходзячыся ў Маскве, А. Чарвякоў прымае актыўны ўдзел у мерапрыемствах і захадах партыі і ўрада, звязаных з падрыхтоўкай да аб'яўлення Савецкай Беларусі. Ён рэдагуе тэкст вядомага Маніфеста, напісанага З. Жылуновічам (Цішкам Гартным), едзе ў Смаленск на шостую абласную партыйную канферэнцыю. Там, у Смаленску, І студзеня 1919 года адбылася падзея гістарычнай важнасці: была аб'яўлена Беларуская Савецкая Рэспубліка. А. Чарвякоў выбраны членам Цэнтральнага Бюро КПБ(б), прызначаны народным камісарам асветы Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі.

Але наперадзе былі нялёгкія выпрабаванні, войскі панскай Польшчы акупіравалі частку тэрыторыі Беларусі і Украіны. Партыя накіроўвае Чарвякова ў 16-ую армію, потым у палітычнае ўпраўленне Заходняга фронту, а калі быў вызвалены Мінск ад белапалякаў, ён узначаліў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Беларусі.

Цікава напісаны ў кнізе У. Якутава раздзел пра Рыжскія мірныя перагаворы з Польшчай, у якіх прымаў удзел Чарвякоў. Увогуле старонкі біяграфіі ўсебеларускага старасты цесна пераплецены з гісторыяй далейшага мірнага будавання Савецкай Беларусі. Аўтар кнігі паказвае, як пад кіраўніцтвам партыі і пры актыўным удзеле Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. Чарвякова мянялася аблічча беларускай вёскі, шырыліся пасяўныя плошчы, аднаўляліся і будаваліся новыя фабрыкі і заводы, адкрываліся навучальныя і навуковыя ўстановы. А. Чарвякоў быў кіраўніком дэлегацыі БССР на Першым Усесаюзным з'ездзе Саветаў, на якім 30 снежня 1922 года быў арганізацыйна аформлены шматнацыянальны братні Саюз Савецкіх Рэспублік.

На канкрэтных фактах У. Якутаў паказвае, што ў асобе А. Чарвякова Савецкая Беларусь мела дзяржаўнага і партыйнага дзеяча ленінскага гарту, такога кіраўніка, які заўсёды быў разам з народам, на самых адказных участках будаўніцтва ў горадзе і ў вёсцы. Ён многа працы і энергіі аддаў першынцу беларускай энергетыкі — Асінторфу, будоўлям у Мінску, Гомелі, Віцебску, калектывізацыі вёскі, многа ўвагі ўдзяляў рабоце універсітэта, Акадэміі навук, быў асабіста знаёмы з многімі пісьменнікамі, артыстамі, вучонымі.

Кніга У. Якутава — не проста хроніка жыцця выдатнага дзеяча партыі, вернага ленінца, гэта жывы летапіс гісторыі нараджэння Савецкай Беларусі, яркая карціна стваральнай працы ў нашай рэспубліцы ў даваенныя гады. У гэтым сіла і асаблівая вартасць біяграфічнага нарыса пра А. Чарвякова.

Выдавецтва «Беларусь» зрабіла добрую справу, выпусціўшы напярэдадні слаўнага юбілею рэспублікі дакументальны нарыс У. Якутава пра вернага сына беларускага народа. Няхай гэтая кніга будзе пачаткам серыі кніг пра выдатных дзеячаў Камуністычнай партыі ў першыя гады дзяржаўнага будавання Савецкай Беларусі.

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ.

ЖЫВЕ ЧАЛАВЕК СЯРОД НАС...

Расказаць пра Антона Антонавіча Уса — чалавека, вучонага, камуніста — хочацца і варта. За кожнай сустрэчай з ім, гутаркай, у перапісцы — радасць сувязі з асобай, цікавай без сумнення, духоўна шчодрай і заўсёды прынцыповай.

З Антонам Антонавічам мне давялося ўпершыню пазнаёміцца ў студэнцкі час на лекцыях у брэсцкім педінстытуце. Новы выкладчык рускай літаратуры прыцягваў да сябе ўвагу нетаропкай паважнасцю рухаў, «акадэмічнай» бародкай, зусім тады непрывычнай. Ішоў 1952 год. Наша разнамасная аўдыторыя неяк адразу падабралася, затаілася ва ўважлівым чаканні. А ён не спяшаючыся і зусім па-дамашняму пачаў гаварыць пра Чэхава і Горкага, карціны Рэпіна і спектаклі МХАТа. Ён асабіста ведаў тых, пра каго мы толькі ў падручніках чыталі, з многімі разам вучыўся ці працаваў. Быў на кватэры ў самога Маякоўскага, прысутнічаў на рэпетыцыях Неміровіча-Данчанкі, бываў на прэм'ерах Таірава і Меерхольда. Для нас, пачынаючых, «студыёзаў», лекцыі-гутаркі Уса неўзабаве сталі акном, раскрытым у вялікі свет мастацтва. Мы адчулі яго атмасферу...

Думаеш зараз пра гэта, і ажываюць зусім яшчэ маладыя твары таварышаў па факультэту: Павел Кірыёнчык, Валодзя Гіламёдаў, Міша Гелер, Дзіма Дошчык, Валодзя Чэрнік... У кожнага з іх даўно вызначылася дарога ў жыцці, але ўсе яны — упэўнены — добрым словам прыгадваюць Антона Антонавіча Уса. Аднаго з іх, нашага актыўнага гурткоўца, сустрэў нядаўна. Для большасці яго саслужыўцаў цяпер ён Дзмітрый Раманавіч Дошчык — загадчык Камянецкага раённага аддзела народнай асветы, заслужаны настаўнік рэспублікі. Наспех пагаварыўшы пра «справы марныя», спытаў мяне пра Уса — ці чытаў яго артыкулы ў «Немане» і «ЛіМе», як яго здароўе, над чым працуе?.. Дошчык — вялікі аматар выяўленчага мастацтва, заўзяты прапагандыст жывапісу ў школах раёна, часам і сам бярэцца за эцюднік... А пачалося ж у студэнцтве, у семінары Антона Антонавіча.

І яшчэ адно характэрна. На сваіх лекцыях Ус не звужаў тэмы да размовы пра пісьменніка ў «беспаветранай прасторы». Наадварот, заўсёды ў яго знаходзілася мноства паралеляў, параўнанняў, выхадаў у іншыя віды мастацтва. Калі гутарка, скажам, пра Горкага, то ўжо тут не абысціся і без Станіслаўскага, без шчукінскага Булычова, без падзей і асоб, прама або ўскосна звязаных з пісьменнікам.

У лекцыях Уса не было славесных пасажаў на эфект. Затое заўсёды адчувалася глыбіня думкі, прапушчанай праз уласнае «я». Таму што, як тады, так і цяпер, у аснове ўсяго — шчырая любоў да справы, якой ён назаўсёды прысвяціў сябе і да якой ішоў упарта, праз усе — і нялёгкія — жыццёвыя раздарожжы.

...Вёсачка Мішуковічы на Гродзеншчыне. Там ён нарадзіўся ў бядняцкай сям'і. Падлеткам батрачыў. Перад смерцю бацька паспеў купіць на кірмашы два буквары — рускі і польскі. З іх пачыналася для малалетняга падпаска пісьменства... Першая сусветная вайна назаўжды разлучыла Антона з ціхімі роднымі мясцінамі, бязлітасна штурхнула ў вір падзей. У акопах імперыялістычнай вайны пранікла ў свядомасць маладога салдата бальшавіцкая праўда. У красавіку 1917 года ў густым натоўпе шынялёў і бушлатаў слухае ён прамову правадыра рэвалюцыі. Гэтая сустрэча з Леніным, пранікнёная логіка яго думак беспаваротна вызначылі жыццёвыя перакананні Антона Уса. А ў 1919 годзе добраахвотнік Чырвонай Арміі становіцца камуністам. Адбылося гэта на фронце пад Бугульмой у пятай арміі Тухачэўскага, якая змагалася супраць Калчака.

Жыццё набыло дакладны сэнс, і ён гатовы быў да любых цяжкасцей. Партыя патрабавала ведаў, вучобы. А за плячамі будучага прафесара-мастацтвазнаўца толькі бацькоўскія буквары. Проста з грамадзянскай — на рабфак. Пачынаў з азоў, а праз колькі год стаў студэнтам Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Лекцыі, заробкі на жыццё, начамі — кнігі, дзесяткі кніг! Потым — аспірантура Інстытута Чырвонай прафесуры, і зноў дні і ночы ў карцінных галерэях, у выдавецтве, над уласнымі артыкуламі.

Напэўна, жылістая сялянская працавітасць, аптымізм у цяжкія гады, вера камуніста ў абавязковую перамогу праўды палюбіліся вялікаму паэту Якубу Коласу ў Антоне Усе. І яшчэ — цяга да роднай зямлі і яе людзей. Такім быў і сам Канстанцін Міхайлавіч, паводле сведчанняў усіх, хто яго ведаў. Гэтая дружба перажыла нямала, а пачалася ў 1934-ым. На коласаўскую «Новую зямлю» Антон Ус апублікаваў рэцэнзію, у якой даў бой фальсіфікатарам паэмы. Некаторых са славутых у тыя часы крытыкаў яўна бянтэжылі нацыянальны каларыт, буйныя народныя характары — якраз тое, што зрабіла бессмяротным выдатны твор. Пра гэта прама і рэзка сказаў у сваім выступленні на пленуме пісьменнікаў у Мінску загадчык сектара мастацтваў ЦК Кампартыі Беларусі Антон Ус. Нажыў нядобразычліўцаў, але затое набыў вялікага і шчырага на ўсё жыццё сябра. У крывавым жніўні 41-га, з дарогі эвакуацыі Якуб Колас піша Усу пранікнёныя радкі: «...Ах, дорогой друг, как бы мне хотелось повидать тебя, поговорить с тобой! Когда-то мы так часто встречались, о многом говорили. Я помню время, когда ты жил в Тербутах летом на даче. Ходили мы в лес, собирали грибы. Как сильно тоскую я по своим родным местам!.. Будь же проклят Гитлер и исчезнет с лица земли вместе со своим кровавым делом...» На экземпляры сваёй «Дрыгвы», падараваным другу, Якуб Колас напісаў:

Не вялікі ды добры быў час,
І аб ім як не ўспомніць
хоць раз.
Толькі Свіслач, лугі і лясы
І жыцця маладога вакол
галасы.
Мы ж, як вандроўнікі ў гэтым
жыцці,
Аглядалі рубеж, што мінулі
ў пуці.

У 1935 годзе Уса прызначылі дырэктарам Інстытута выяўленчых мастацтваў у Ленінградзе. На вакзале ў Мінску яго праводзілі Я. Колас, П. Галавач, М. Гарэцкі, М. Хведаровіч. Ён падтрымліваў сувязь з сябрамі з Беларусі ўвесь час, пакуль было магчыма. У родныя мясціны Антон Антонавіч вярнуўся толькі ў 1944-ым, неўзабаве пасля вызвалення Мінска. У пасляваенныя гады працаваў у вільнюскім педінстытуце, у 1952 годзе прыехаў у Брэст... І тут аказаўся ў гушчыні спраў і клопатаў. Лекцыі ў педагагічным інстытуце, прапаганда мастацтва сярод насельніцтва, артыкулы ў прэсе.

З 1945 года Ус — член Саюза мастакоў СССР. Але цесная сувязь з майстрамі пэндзля пачалася ў яго задоўга да таго. У пачатку 30-ых гадоў, загадваючы аддзелам выяўленчага мастацтва ў Дзяржвыдавецтве, Ус зблізіўся з многімі выдатнымі жывапісцамі: Кардоўскім, Юонам, Ражскім, Сварогам... Школа для будучага мастацтвазнаўца. Артыкулы Уса паводле праблем мастацтва заўсёды палемічныя, выклікаюць на роздум. У 1931 годзе ён надрукаваў вялікі артыкул пра мастакоў «Мира искусства». Даўняя публікацыя не пакрылася архіўным пылам, праз дзесяцігоддзі яе зноў цытуюць. Яна працягвае жыць. Не страцілі значэння артыкулы аб Рэнесансе і Барока ў беларускім мастацтве, «Рафаэль і эпоха Адраджэння» і іншыя. У 1976 годзе ў часопісе «Неман» Ус апублікаваў свае развагі аб карцінах брэсцкага мастака Эдуарда Куфко — грунтоўнае даследаванне творчасці таленавітага жывапісца, які працуе над антыфашысцкай тэмай. Гэта толькі некалькі прыкладаў.

Беларускія мастакі памятаюць яркія выступленні Уса на з'ездах і пленумах. Для яго не існуе рангаў і палажэнняў у мастацтве. Ёсць толькі адно і самае галоўнае — талент, сумленнасць і грамадзянскі абавязак майстра-творцы. Без удзелу старэйшага мастацтвазнаўца і цяпер не праходзіць ні адна колькі-небудзь значная падзея ў дзейнасці брэсцкага філіяла Саюза мастакоў: няхай гэта будзе абмеркаванне выстаўкі або сход творчага калектыву. Усе ведаюць — слова Уса будзе аб'ектыўным. Яму часта звоняць з партыйных органаў, з педінстытута, са школ і бібліятэк. Просяць выступіць перад моладдзю, падзяліцца ўспамінамі, прачытаць лекцыю.

Цяпер Антону Антонавічу Усу 86 гадоў. Ветэран партыі і працы, персанальны пенсіянер саюзнага значэння. Ордэн «Чырвоная Зорка», медалі, Ганаровыя граматы Вярхоўнага Савета БССР і ЦК камсамола рэспублікі, памятныя адрасы ад праўлення Саюза мастакоў Беларусі. А ён, камуніст ленінскага закліку, і цяпер на сваім пасту. Па-ранейшаму страчыць-пастуквае пішучая машынка, а вечарамі доўга не гасне зеленаватае святло настольнай лямпы.

М. РЫБАКОЎ,
кандыдат філалагічных навук.

Брэст.

ЁСЦЬ НА КАРЦЕ АКЦЯБРСКІ

Пэўна, такім ужо ўрадзіўся чалавек, што дзе б ён ні быў і як бы там ні жыў, а цягне яго ў тую мясціну, дзе нарадзіўся, дзе ўпершыню басаногі пратупаў па жаўтапеску і адчуў цеплыню роднай зямлі, яе дабрыню і прыгажосць. У гэтым, мабыць, і сіла чалавека, яго еднасць са ўсім тым, што звязана з родным кутам, што адбывалася на гэтай зямлі, якую мы ў нечым атаясамляем з бясконца дарагім, шырокім і ўсеабдымным паняццем — Радзіма.

Менавіта адсюль, з Акцябршчыны, пачыналася Радзіма і для мяне. І калі я вяртаюся з далёкіх ці блізкіх дарог у свой родны гарпасёлак, ён заўсёды сустракае мяне па-зямляцку пяшчотна і палка такім жа, якім запомніў яго з дзяцінства, і ў той жа час не такім — з умудроным поглядам сталасці і іскрыстай усмешкай папрыгажэлай маладосці, бо з кожным годам Акцябрскі раздаецца ўшыркі і расце ў вышыню. Здаецца, яшчэ зусім нядаўна на гэтым месцы, што абапал шашы на Калінкавічы, не было нічога, а сёння ўзвышаюцца чатырох- і пяціпавярховыя гмахі новага мікрараёна, пачатак якому паклала ў свой час сельскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча.

І так кожны раз, калі прыязджаеш у родныя мясціны, сярод прывычнага і звыклага абавязкова прыкмячаеш нешта новае, народжанае за час тваёй адсутнасці. Так было і зусім нядаўна: прыехаў і не пазнаў плошчы Бумажкова — з аднаго боку яе ўпрыгожыў чатырохпавярховы адміністрацыйны будынак, з другога — раённы Дом культуры. А там, дзе размясцілася цэнтральная сяліба мясцовага саўгаса «Акцябрскі», выраслі новыя механізаваныя майстэрні, крыху далей ад іх узводзіцца жывёлагадоўчы комплекс...

Я крочу па вуліцах свайго гарпасёлка, углядаюся ў яго абрысы — і многае ўваскрашае памяць, бо вуліцы, як і людзі, маюць і свае імёны, і свае біяграфіі. Вось вуліца Савецкая. Роўнай заасфальтаванай стужкай, атуленая засенню дрэў, праразае яна райцэнтр і, пераскочыўшы па мосце на другі бок Нераторўкі, бяжыць далей, у бок вёскі Кавалі. Многае бачыла і перажыла на сваім вяку гэтая вуліца, бо менавіта на ёй, дзе раней стаяў маёнтак чорнага барона Урангеля і размяшчалася валасная ўправа, адбываліся асноўныя падзеі, якія непасрэдна звязаны з гісторыяй гарпасёлка Акцябрскі. Праўда, у той час не было ні гэтай вуліцы, ні самога гарпасёлка. Былі дзве вёскі — Рудабелка і Карпілаўка, якія раз'ядноўвала наравістая рэчка Нераторўка. Рудабелка была цэнтрам гэтага забытага царом і богам, адрэзанага дрыгвянымі балотамі і непраходнымі лясамі палескага кутка. У ёй налічвалася восемдзесят сялянскіх двароў, сярод якіх узвышалася вялікая панская сядзіба з паркам, а таксама былі дзве царквы, валасная ўправа, гандлёвы склад і вінакурны завод, якія належалі барону Урангелю, як і ўся зямля з навакольнымі вёскамі.

Але толькі вонкава Рудабелка здавалася сцішанай. Знутры ж яна была гатовая ў любы час да выбуху гневу супраць прыгнятальнікаў. І хоць не было ў Рудабелцы ні тэлефона, ні тэлеграфа, хоць газеты выпісвалі толькі ўпраўляючы маёнтка, валасны пісар і ўраднік, а пошта прыходзіла адзін раз у месяц, але вестка пра тое, што ў Петраградзе адбылася Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, даляцела сюды ўжо на шосты дзень. Яе прывёз прадстаўнік Беларускага павятовага камітэта партыі бальшавікоў, былы салдат, камуніст, ураджэнец гэтых мясцін Аляксандр Раманавіч Салавей. Ён прывёз не толькі гэтую вестку, але і першыя Дэкрэты Савецкай улады аб міры і зямлі. З гэтага часу Рудабельская воласць пачала адлік новай эры.

Помніць Савецкая вуліца 22-га лістапада 1917 года. У гэты дзень перад валасной управай сабраліся былыя парабкі барона Урангеля, сяляне Рудабелкі, Карпілаўкі, Кавалёў, Дубровы і іншых вёсак, каб абвясціць у воласці Савецкую ўладу. Мітынг пачаў Аляксандр Салавей, які абвясціў Дэкрэты аб міры і зямлі. Побач з ім былі яго верныя памочнікі, першыя члены рэўкома Нупрэй Драпеза, Лявон Адзінец, Максім Ус, Максім Ляўкоў. Гэта яны арганізоўвалі сялян і дзялілі з імі панскую зямлю, гэта яны стварылі партызанскі атрад, які з часу акупацыі воласці кайзераўскімі захопнікамі налічваў больш за чатырыста чалавек, гэта яны ў спрыяльны момант прад'явілі ультыматум кайзераўскаму каменданту Рудабелкі, каб той ачысціў воласць са сваімі ваякамі, і камендант не мог аслухацца, выканаў ультыматум рэўкома.

Я крочу па Савецкай вуліцы і міжволі прыпыняюся каля трохпавярховага будынка Акцябрскай сярэдняй школы, якая носіць імя Аляксандра Салаўя. У гэтым і ў іншых імёнах жыве памяць і павага нашчадкаў да тых, хто на гэтай зямлі ўсталёўваў Савецкую ўладу, хто абараняў яе ад ненажэрных захопнікаў.

Адсюль, з Савецкай, я збочваю на вуліцу Максіма Уса, які ў тыя грозныя гады грамадзянскай вайны быў сакратаром валасной партячэйкі. Гэта ён, калі партызанскі атрад трапіў у акружэнне, падняў партызан і павёў на прарыў белапольскай блакады. Партызаны прарвалі акружэнне. У тым няроўным баі смерцю героя загінуў Максім Ус, памяць пра якога берагуць нашчадкі рудабельскіх камуцараў.

Цяжкі, трагічны лёс напаткаў Лявона Адзінца. У адным з баёў ён трапіў у палон да белапалякаў. У сялянскай хаце вёскі Дуброва яны ўчынілі яму допыт.

— Дзе партызаны, хто спачувае і дапамагае ім?

Але маўчаў, сцяўшы зубы, патрыёт, ні адно слова не зляцела з яго вуснаў.

І тады ворагі распранулі Адзінца і голага вывелі ноччу на вуліцу, на люты піліпаўскі мароз. Так, распранутага, яго вадзілі па вуліцы прыціхлай начной вёскі. Пасля прывялі зноў у тую ж натопленую хату. Боль, які прытупіўся на вуліцы, тут працяў цела з новай сілай, і патрыёт страціў прытомнасць. Калі вярнулася свядомасць, яго зноў пачалі дапытваць, але ў адказ зноў не пачулі нічога.

Некалькі разоў выводзілі акупанты на мароз Лявона Адзінца. Але так і не дабіўшыся нічога, пакінулі яго, беспрытомнага, у хаце ў надзеі, што ён не ачуняе. Толькі выжыў бальшавік: мясцовыя сяляне вярнулі яго да жыцця. Праўда, ён стаў інвалідам, але са строю змагароў за Савецкую ўладу не выбыў. У час фашысцкай акупацыі Мінска на яго кватэры збіраліся падпольшчыкі, захоўвалася зброя, літаратура. Агенты гестапа натрапілі на след і высачылі мужнага падпольшчыка. Лявон Адзінец быў закатаваны ў фашысцкім засценку...

У жорсткіх баях адстойвалі сваю родную Савецкую ўладу рудабельскія камунары. Многія з іх аддалі сваё жыццё, каб зорка новага свету, што ўзышла над родным краем, з кожным днём разгаралася ўсё ярчэй і ярчэй. І калі ў дваццатым годзе воласць поўнасцю была ачышчана ад захопнікаў і іх памагатых, у Рудабелцы адбыўся мітынг, на які з'ехаліся сяляне ўсіх навакольных вёсак.

— Рэвалюцыя вызваліла нас ад прыгнёту, дала нам зямлю і волю, адкрыла шырокі шлях наперад. Дзякуючы ёй мы набылі сваю дзяржаўнасць, — гаварылі сяляне на мітынгу. — Таму мы прапануем у гонар пралетарскай рэвалюцыі назваць нашу воласць Акцябрскай.

Гэтая прапанова патанула ў дружным воплеску. Так воляй народа на карце рэспублікі замест вёсак Карпілаўка і Рудабелка з'явілася новая назва — Акцябрскі, як сімвал вернасці ідэалам пралетарскай рэвалюцыі. У былым маёнтку барона Урангеля быў створаны першы ў наваколлі саўгас «Рудабелка». У былой Карпілаўцы арганізаваўся калгас «Чырвоны дабраволец». Эканамічна мацнелі, станавіліся на ногі калектыўныя гаспадаркі. Дзве машына-трактарныя станцыі — «Рудабельская» і «20 год Кастрычніка» — абслугоўвалі іх, дапамагалі араць, сеяць, жаць, малаціць. І квітнеў, багацеў, прыгажэў пад зоркай Кастрычніка гэты палескі куток, заможна і шчасліва пачалі жыць тут людзі...

Усё гэта міжволі прыпамінаецца, калі крочыш па вуліцах роднага гарпасёлка. А яны, вуліцы, нібы згаварыўшыся, збягаюцца да цэнтральнай плошчы, якая носіць назву легендарнага партызанскага кіраўніка часоў Вялікай Айчыннай вайны, Героя Савецкага Саюза Ціхана Пімінавіча Бумажкова. А вось ён і сам — здаецца, зараз сыдзе з п'едэстала, прысядзе на ганку адміністрацыйнага будынка, каб пагаварыць аб жыцці-быцці са сваімі землякамі.

Тады ж, у той грозны 1941 год, трэба было арганізоўваць людзей, гартаваць іх верай у непазбежную нашу перамогу над ворагам. Як у часы Рудабельскай рэспублікі, людзі згуртоўваліся вакол камуністаў, рыхтаваліся да бітвы з фашызмам. У першыя дні вайны ў Акцябрскім быў створаны першы партызанскі атрад «Чырвоны Кастрычнік». На чале яго сталі сакратар райкома партыі Ціхан Пімінавіч Бумажкоў і член ВКП(б) Фёдар Іларыёнавіч Паўлоўскі. Для арганізацыі партызанскіх атрадаў у раёне райком партыі і райвыканком пакінулі больш за трыццаць партыйных і савецкіх работнікаў з ліку старшынь калгасаў і сельсаветаў. Сярод іх былі Рыгор Бар'яш, Сідар Мельнік, Лаўрэн Мельнік, Барыс Ахраменка, Іван Дайнека і іншыя, якія пасля сталі ўмелымі арганізатарамі партызанскага руху на Акцябршчыне. Ужо ў першым баі на подступах да Акцябрскага каля ракі Пціч партызаны знішчылі дзесятак танкаў і аўтамашын ворага. А неўзабаве каля вёскі Воземля быў разгромлены штаб нямецкай дывізіі, дзе было знішчана 55 броне-і аўтамашын і 18 матацыклаў.

Першыя поспехі народных мсціўцаў не на жарт устрывожылі захопнікаў. Гэта ж нечувана: вакол варожыя гарнізоны, а ў райцэнтры дзеці вучацца ў савецкай школе па савецкай праграме, працуюць савецкія ўстановы, над дахам райвыканкома горада развяваецца чырвоны савецкі сцяг. У канцы ж 1942 года ў памяшканні, што і цяпер стаіць непадалёк ад чыгункі, праходзіць раённая партыйная канферэнцыя, на якой з дакладам аб разгортванні партызанскага руху, каардынацыі баявых дзеянняў атрадаў і брыгад выступіў камісар Акцябрскай партызанскай брыгады, сакратар падпольнага райкома партыі Сямён Васільевіч Маханько. Тут жа было вырашана і такое пытанне, як збор сродкаў сярод насельніцтва на ваенныя патрэбы. І неўзабаве толькі ў адной зоне дзеяння партызанскай брыгады Паўлоўскага было сабрана і накіравана за лінію фронту на будаўніцтва самалётаў і бронецягніка «Савецкая Беларусь» 10.800 рублёў грашамі і 75 рублёў золатам.

І нездарма ў адным з баёў партызаны брыгады № 123, якой камандаваў Фёдар Іларыёнавіч Паўлоўскі, у планшэце забітага гітлераўскага афіцэра знайшлі карту-кіламетроўку, на якой Акцябр быў абведзены чырвоным алоўкам і там жа алоўкам пазначаны: «Другая Масква».

Чым жа так дапёк гэты невялічкі раённы цэнтр фашысцкім захопнікам, што яны пазначылі яго такою назвай? Адказ будзе толькі адзін: сваёю стойкасцю, мужнасцю, гераізмам, самаддана барацьбой з ворагам. І фашысты не памыліліся, калі лічылі, што ў раёне ўсе партызаны—ад малога да старога. Яно і сапраўды было так. Партызанскі рух набыў масавы характар, ператварыўся ў грозную сілу для захопнікаў. Ужо к восені 1943 года ў Акцябрскай зоне дзейнічала каля васемнаццаці тысяч партызан. А тыя, хто не трымаў у руках зброі, забяспечвалі для народных мсціўцаў надзейны тыл: пастаўлялі харчаванне, вопратку, медыкаменты, збіралі зброю.

Акцябрскі не скарыўся, Акцябрскі змагаўся. І тады вораг адклікаў з фронту больш чым дзве адборныя дывізіі і пачаў наступленне на райцэнтр. Карная экспедыцыя агнём прайшлася па населеных пунктах раёна. Гарэлі Кавалі, Лаўстыкі, Карпілаўка, Рудня, Вежын, Смуга, Курын, Глебава Паляна і іншыя вёскі, у полымі агню гінулі іх жыхары. Больш чым пяць тысяч чалавек — у асноўным жанчын, дзяцей і старых — знішчылі тады карнікі. Але не скарылася Акцябршчына, яна вяла мужную, гераічную барацьбу, выстаяла і перамагла.

Выстаяла і перамагла яна не толькі ў грозны час вайны, выстаяла і перамагла і ў пасляваенны час, аднавіла разбураную вайной гаспадарку, выйшла на новыя рубяжы. Даўно зямлянкі, што з'явіліся ў першыя пасляваенныя гады, саступілі месца дабротным дамам. А цяпер і гэтыя дамы вымушаны саступіць месца шматпавярховым камяніцам. Даўно знікла мяжа, што падзяляла вёскі Карпілаўку і Рудабелку, за пасляваенныя гады вёскі злучыліся і ўтварылі гарадскі пасёлак Акцябрскі — адміністрацыйны раённы цэнтр і цэнтральную сядзібу саўгаса «Акцябрскі».

А гарпасёлак з кожным годам разрастаецца і прыгажэе. Умацоўвае сваю эканоміку мясцовы саўгас. Неяк у гутарцы дырэктар саўгаса Аляксандр Андрэевіч Калеснік прывёў такую аналогію: перад вайной жыхары вёскі Карпілаўка за высокія ўраджаі бульбы і збожжавых былі прэміяваны аўтамашынай-паўтаратонкай, а не так даўно іх саўгас за тыя ж поспехі атрымаў ва ўзнагароду аўтамашыну «ГАЗ-53 Б».

— Як бачыце, — падкрэсліў Аляксандр Андрэевіч, — традыцыі нашых папярэднікаў жывуць і памнажаюцца. Ураджайнасць збожжавых у параўнанні з даваеннай вырасла ў пяць разоў, бульбы — больш чым у два разы. Праўда, і тэхнічная ўзброенасць сельскай гаспадаркі значна ўзрасла. Вось памяркуйце: у 1953 годзе дзве МТС, што абслугоўвалі гаспадаркі раёна, налічвалі 82 трактары і 38 аўтамашын, а сёння адзін наш саўгас мае 60 трактароў і каля 50 аўтамашын. А вазьміце камбайны. Тады яны былі рэдкасцю, а зараз толькі на палі нашай гаспадаркі адразу выходзіць чатырнаццаць збожжавых, столькі ж бульбаўборачных, не гаворачы ўжо аб сіласаўборачных.

Змены, змены... Яны на кожным кроку, яны радуюць і натхняюць. Адышлі ў нябыт дрыгвяныя балоты, на іх месцы каласяцца ўрадлівыя нівы. Не палае на камінку смольны корч лучыны — ва ўсіх дамах гарыць электрычнасць. Ёсць у Акцябрскім і свой тэлефон, і свой тэлеграф, у кватэрах гаворыць радыё, свецяцца экраны тэлевізараў, а ў кожную кватэру прыходзіць у дзень па некалькі перыядычных выданняў.

Усё гэта здабыта нашымі рукамі, усё гэта наша, усё гэта нам дорага, як дарагая памяць аб тых, хто ўсталёўваў на гэтай зямлі Савецкую ўладу і са зброяй у руках абараняў яе ад ворагаў. Нам памнажаць тое, што яны паспелі зрабіць, нам несці наперад эстафету, прынятую з іх рук.

Уладзімір ПРАВАСУД.

Станаўленне майстэрства

ЗАСЛУХАЕШСЯ Васіля Пятровіча, як пачне ён расказваць пра родную вёску Качаны. Прыйдуць у суседняе сяло на танцы — для «качаноў» асаблівая полька належала: толькі яны дзяўчат запрашаюць. То была своеасаблівая даніна павагі вёсцы, што славілася людзьмі строгімі і справядлівымі, хаця іншы раз і крутога нораву, і ўмелымі на ўсе рукі. Бацька Васіля Пятровіча быў майстрам кавальскай справы, боты шыў, печы складаў, дом ад падмурка да даху сам будаваў. А брычкі яго са спружыністымі рысорамі, упрыгожаныя інкрустацыяй з розных парод дрэва, былі прадметам сямейнага гонару і ўсеагульнага захаплення. Маці займалася вышыўкай, пераборным ткацтвам. Малюнкі сама прыдумляла, а суседкі хадзілі да яе па ўзоры.

Васіль часта замест дзіцячых гульняў гутарыў з дарослымі. Збяруцца руплівыя, разумныя мужчыны, абмяркоўваюць свае справы. Хлопчык слухаў з усёй сур'ёзнасцю, сціпла прыткнуўшыся дзе-небудзь збоку. Яму падабалася доўгая, грунтоўная размова, нетаропкія словы і жэсты рук... Неўзабаве і з ім пачалі гаварыць як з роўным. І цяпер успамінаюцца тыя вечары, праведзеныя з героямі яго будучых твораў.

У юнацтве выбіраў Васіль Пятровіч шляхі нікім не прадбачаныя. Прадказвалі яму матэматычную будучыню — а ён паступіў у мастацкае вучылішча. Цікава, што такое рашэнне прыйшло пад уплывам выкладчыка матэматыкі Мядзельскай сярэдняй школы — заўзятага аматара мастацтва. У вучылішчы педагогі ўбачылі ў Васілю прыроджанага жывапісца—а ён паступіў у інстытут на аддзяленне графікі. Хаця жывапіс любіў. Пісаў па-свойму, наперакор настаўленням многіх жывапісцаў не захапляўся шматколернасцю, аддаючы перавагу некалькім ясным, насычаным колерам. Асабліва не любіў «слязлівай» акварэлі. Заняўся асваеннем графічных тэхнік, у першую чаргу — лінагравюры. І зноў — супярэчлівасць развіцця мастака. Пры яўнай схільнасці да станковай графікі, да закончанага і замкнёнага вырашэння кожнага ліста,— стаў мастаком кнігі. Чытаў днямі і начамі: Льва Талстога, Дастаеўскага, Кузьму Чорнага, Якуба Коласа і, асабліва, паэзію Янкі Купалы, у якой знайшоў нешта самае роднае сабе па духу. У Коласа — характары зямныя, канкрэтныя, нібы бачныя. У Купалы прыцягвала іншае — вялікая паэтычная абагульненасць, узвышаная чысціня вобразаў, яркасць лірычнага струменю. І мастак пачаў пастаянна звяртацца ў сваёй творчасці да яго твораў. Першы раз — у дыпломнай рабоце...

Васілю Пятровічу не ўласціва ў ілюстрацыі падрабязнае бытапісанне, ён не захапляецца вельмі канкрэтнымі характарыстыкамі. Герояў сваіх твораў лепіць абагульнена, кожны разумеецца ім як увасабленне тых або іншых самых істотных рыс народнага, сялянскага тыпажу. Я не выпадкова кажу «лепіць» — графіка Шаранговіча вызначаецца вялікім адчуваннем пластыкі, буйной аб'ёмнай формы.

Першай графічнай тэхнікай, якую ён асвоіў у інстытуце, была лінагравюра. Тэхніка, умоўна скажам, вельмі кантрастная, якая прывучае мастака аперыраваць перш за ўсё плямамі чорнага і белага, знаходзячы іх суадносіны, раўнавагу, шукаць магчымасці новых рашэнняў, карыстаючыся мінімальнымі сродкамі.

У студэнцкія гады Шаранговіч не вельмі прыглядаўся да працэсаў, якія адбываліся ў савецкай і беларускай графіцы ў 60-ыя гады. Аднак агульныя тэндэнцыі як бы невядомымі шляхамі ўплываюць, а часам і вызначаюць творчасць усяго пакалення. Так і захапленне лінагравюрай у тыя гады было ўсеагульным, і імкненне да лаканізму, да манументальнай сімволікі вобразаў ахапіла ўсе віды выяўленчага мастацтва. Кніжныя ж графікі выступілі супраць прамой сюжэтнай ілюстрацыйнасці. Ілюстрацыя стала не столькі сродкам раскрыцця сюжэта і бытапісання ў адпаведнасці з тэкстам, колькі выражэннем эмацыянальных адносін мастака да літаратурнага твора.

У першай жа кнізе, афармленай Шаранговічам, — «Зямля» Кузьмы Чорнага,— вызначыліся творчыя імкненні маладога аўтара. Ён выбраў «Зямлю», таму што сама задума пісьменніка дазволіла пазбегнуць «бытавізмаў».

Дакладна пабудаваныя і закончаныя работы Васіля Пятровіча заўсёды могуць існаваць і ў кніжным арганізме, і як самастойныя творы. Такая серыя лінагравюр, створаная паводле паэмы У. Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін» (1969 г.). Маштабнасць, гістарызм вобразаў паэмы на дзіва дакладна ўвасобіліся ў графіцы. У насычана-падзейных аркушах прасочаны этапы нарастання рэвалюцыйнага ўздыму. Серыя нібы напоўнена гулам гісторыі, таму што выяўленчая будова кожнага аркуша нараджае сваю гукавую асацыяцыю: звон ланцугоў і глухі гоман гневу, сакрушальны ўдар молата па двухгаловаму арлу, цвёрды, рытмічны крок паўстанцаў, атрады будзёнаўцаў на варце рэвалюцыі, барабанны пошчак і... маўчанне, схіленыя сцягі. Завяршальны аркуш зноў-такі ў «агучанай», вобразнай будове — Ленін паказаны палымяным трыбунам — сцвярджае неўміручасць ідэй правадыра. Характэрна, што ў персанажах гэтай серыі пазнаецца абраны Васілём Пятровічам тып беларускага селяніна, які сустракаецца амаль ва ўсіх яго творах. Гэта атрымалася ненаўмысна. Такая ўнутраная прывязанасць да пэўнага нацыянальнага тыпажу ў крыві мастака. Са сваімі героямі ён «хлеб еў», гаворыць сам Шаранговіч, падкрэсліваючы тым самым асабістую з імі непадзельнасць. У той жа час аркушы асабістую з імі непадзельнасць. У той жа час аркушы да паэмы такія ўнушальныя ў паказе сутнасці з'явы, што яны маглі б «вытрымаць» шматразовае павелічэнне. Яны нечакана манументальныя, здаецца, нават больш, чым магчыма гэтая якасць у графічным творы. Мастак, які заўсёды шукае, пастаянна зведвае пачуццё вострай незадаволенасці — нават калі твор апрабаваны і прызнаны, імкнецца графічнымі сродкамі сказаць больш, чым уласціва графіцы. І, напэўна, такое жаданне апраўдана...

Упамянёная супярэчліваць станаўлення мастака адбіваецца і цяпер у творчай супярэчлівасці паміж абраным метадам і асаблівасцямі вобразнага мыслення. Між іншым, гэтая супярэчлівасць у многім і вызначае індывідуальнасць мастака.

Рысы манументальнай графікі ўласцівы вядомаму цыклу Шаранговіча «Народныя майстры» (1971 г.), ёсць яны і ў літаграфіі «А хто там ідзе?» (1976 г.). Гэтыя аркушы маглі б стаць эскізамі насценных роспісаў — выразнай стройнасцю мастацкай формы, якая ўвасабляе думку пра годнасць народа.

З ростам майстэрства Шаранговіч пакідае тэхніку лапідарнай лінагравюры і пераходзіць да больш рухомай і танальна багатай літаграфіі. І, не адмаўляючыся ад дыпломнай работы, дзе ўжо была спроба паэтычнага абагульнення, мастак вяртаецца ў 1977 годзе да паэм Купалы. Тут ён больш пільна ўнікае ў асаблівасці сюжэтна-эмацыянальнай канвы кожнай паэмы і адначасова імкнецца перадаць фальклорную велічнасць. Тут адчуваецца некаторая барацьба ілюстрацыйнага пачатку з эпічным. Канкрэтнасць аб'ёмнай лепкі ў адных аркушах — такая скульптурная фігура старога гусляра з паэмы «Курган» — спрачаецца з плоскасна-лінеарнымі прыёмамі ў іншых. Гэта абарочваецца супраць стылістычнага адзінства серыі, але кожная паэма раскрываецца глыбока, эмацыянальна. Песенна-гарманічныя аркушы да паэмы «Яна і я». Некалькі тэатральна-трагедыйныя інтанацыі ўплятаюцца ў тканіну своеасаблівай народнай балады, якой, думаецца, можна назваць «Магілу льва». Як драму народнага жыцця ўбачыў мастак паэтычны сказ «Зімою». Васіль Пятровіч спадзяецца суміраваць, па-новаму асэнсаваць раннюю сваю работу і гэтую, каб стварыць яшчэ адзін цыкл паводле матываў творчасці Купалы — альбом да стагоддзя з дня нараджэння паэта.

Напэўна, няма ў рэспубліцы мастака, шырокавядомага, які б не закрануў у тым або іншым аспекце тэму Айчыннай вайны. Прычым, чым далей у мінулае адыходзіць падзея, тым больш ярка бачыцца яе героіка-эпічны сэнс. І сэнс абвінавачвальны, накіраваны супраць фашызму і ўсялякай чалавеканенавісніцкай ідэалогіі. Стараннае даследаванне фактычнага матэрыялу пісьменнікамі, мастакамі патрэбна для стварэння твораў сучаснага гучання, якія сцвярджаюць актуальнасць памяці аб мінулым для сённяшняга дня і будучыні чалавецтва.

Тым жа гнеўным публіцыстычным пафасам, што і творы А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка, А. Бялевіча, напоўнена серыя Шаранговіча «Памяці вогненных вёсак». Работа над ёй пачалася з невялікага цыкла да аповесці Бялевіча, прысвечанай Хатыні. Цяпер аркушы пабольшалі. Не толькі памерам, але і змястоўнай насычанасцю. Ад прывязкі да канкрэтнага сюжэта яны перайшлі ў катэгорыю вобразаў манументальна-сімвалічных. Чорна-чырвоны каларыт пажарышчаў і агню, захаваўшы нястрымна-трагедыйнае напружанне, стаў каларытам людскіх страсцей і лёсу. Дзейная асоба серыі — народ. Мноства фігур і асоб запаўняюць амаль усю выяўленчую паверхню. Падобна разгледжанай серыі да паэмы Маякоўскага, эмацыянальную атмасферу гэтага цыкла ствараюць гукавыя асацыяцыі. Як бы чуюцца гнеўныя галасы, крыкі, выццё чырвоных крылаў полымя і ветру. А сумныя званы Хатыні тут ператварыліся ў велізарны набат, які нібыта гудзе на ўвесь свет. І ў гэтай інтэнсіўна-гукавой будове ёсць паўзы маўчання, напружанага роздуму. Яны—у кампазіцыях з партрэтамі Камінскага з Хатыні і бацькі мастака, які быў партызанскім кавалём. І, зноў-такі, кожная кампазіцыя маштабнасцю сваёй, абагульняючым сэнсам вобразаў выходзіць за рамкі графічнага аркуша, нібыта просіцца на большы памер і шырэйшы агляд.

«Калі працую, ёсць надзея, што атрымаю жаданае, — гаворыць мастак. — Калі заканчваю — няма стану больш цяжкага... Тады звычайна пачынаю разумець, што не сказаў сваёй працай таго, што хацеў. Таму і адбіткаў раблю іншы раз усяго па аднаму-два экземпляры. Відаць, з гадамі змагу знайсці ў сваёй рабоце нешта каштоўнае...»

Самакрытычнасць вызначае і творчы, і чалавечы характар Васіля Пятровіча. Яму, вядома, ад гэтага не лягчэй жывецца. Аднак памылкова было б лічыць творчы шлях лёгкім. А бязлітасная самакрытычнасць — адна з самых неабходных умоў ва ўзыходжанні мастака да вышынь мастацтва. Важна толькі, каб вяла яна за сабой не расслабленасць, а наадварот — упэўненасць у сваіх сілах. «Заўсёды ёсць надзея, што яшчэ змагу, яшчэ зраблю нешта значнае. Гэта і падтрымлівае...» — гаворыць Васіль Пятровіч.

Шаранговіч 1939 года нараджэння. Яшчэ нядаўна ён лічыўся ў спісах маладых мастакоў. Але вось прайшло ўжо 11 гадоў, як ён выкладае ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце, кіраўнік кафедры графікі. Як ва ўсякага вопытнага педагога, у яго свой падыход да выхавання мастака. Першае патрабаванне — рабочая дысцыпліна. Магчыма, прыхільнікі больш свабодных і надакучлівых форм педагагічнага ўплыву запярэчылі б: цікавасць, захопленасць — яны і ёсць залог дысцыпліны. Але Васіль Пятровіч перакананы, што неабходна і доля адміністрацыйнага прымусу, працоўны рытм павінен быць выразным і няспынным. «Ніхто ніякіх ісцін не адкрые, — заўважае Васіль Пятровіч, — толькі ў працы яны спасцігаюцца. Я думаю, калі чалавек чымсьці сур'ёзна заняўся, ён праз працу павінен дакапацца да самых глыбокіх прафесійных асноў сваёй справы».

Магчымасці ва ўсіх студэнтаў розныя. Аднаму можна даць «свабоду», другога трэба «вадзіць за руку». Але канкрэтных указанняў адносна заган таго або іншага малюнка мала. Асноўны і галоўны прынцып Васіля Пятровіча: ставіць перад студэнтамі больш складаную задачу — працаваць над праблемамі, шукаць уласнае іх вырашэнне. Няхай яны памыляюцца, шукаюць, няхай часам пакутлівы гэты працэс, але калі думка ўвайшла ў свядомасць, калі яна зразумелая, вынік — быць можа, не адразу—абавязкова выявіцца. Заўважым, што выправіць студэнцкую работу педагогу было б лягчэй. Але ці ёсць карысць ад такога непасрэднага ўмяшання? Не, перакананы Шаранговіч, толькі самастойна знойдзенае рашэнне фарміруе мастака.

Гэта методыка навучання — не нехта дапамог, а сам дамогся! — дапамагае ў выхаванні гонару, прафесійнай годнасці студэнта. Дыялектычнае спалучэнне прафесійнай упэўненасці з незадаволенасцю і складае сам працэс творчага жыцця, які, пачынаючыся ў юнацтве, ніколі не павінен закончыцца. Незадаволенасць заўсёды абуджае да пошуку. Крытычныя адносіны да вынікаў пошуку нараджаюць новую незадаволенасць.

Гэтыя думкі Васіля Пятровіча аб выхаванні мастака, у многім пацверджаныя выказваннямі майстроў савецкага і сусветнага мастацтва, апрабаваны яго ўласнай практыкай. І самыя красамоўныя — яе вынікі. Што ні абарона дыпломных работ на кафедры графікі, то новае творчае папаўненне атрада мастакоў рэспублікі. Ужо вядомыя афармленнем кніг і графічных цыклаў У. Савіч, М. Селяшчук, В. Валынец, У. Славук, Я. Зельская і многія іншыя — вучні Васіля Пятровіча, якімі можна ганарыцца. Сам жа ён сурова заўважае: «Мы нічога не варты, калі наступнае пакаленне не будзе лепшае за нас...»

Э. ПУГАЧОВА.

СЭРЦА СЭРЦУ ВЕСТКУ ПАДАЕ

НАРОДНЫ АРТЫСТ СССР Цімафей ЛЯЎЧУК — ЗАСЛУЖАНАМУ ДЗЕЯЧУ МАСТАЦТВАЎ БССР Віктару ТУРАВУ

З нагоды юбілейных дзён, якія адзначае цяпер Беларусь, і надыходзячага Новага года я звяртаюся да Вас з гэтым сяброўскім пісьмом. Хочацца, каб са старонак вашай добрай газеты чытачы яшчэ раз даведаліся аб сапраўднай садружнасці кінематаграфістаў нашых братніх рэспублік. Мы прысвячаем свае працоўныя дні, свае творчыя пошукі, усё сваё жыццё развіццю шматнацыянальнага мастацтва нашай краіны. Гэта садружнасць — не толькі радаснае адчуванне супольнасці душ. Не, гэта значна большае!

Каб даць адчуць гэта, я і пастараюся прывесці прыклады. Іх магло б быць вельмі многа.

Напрыклад, прыгадаўшы Міколу Садковіча,— пісьменніка і кінематаграфіста, які, дарэчы, здымаў свае фільмы і на нашай Кіеўскай студыі, калі я рабіў яшчэ першыя свае крокі ў мастацтве, — маеш патрэбу сказаць удзячнае слова яго роднай зямлі, яго сябрам і калегам у Беларусі. Або зусім нядаўняе: творчы лёс звёў мяне з акцёрам славутай купалаўскай трупы Валянцінам Белахвосцікам. Ён так плённа працаваў разам з намі, ствараючы вобраз выдатнага палітычнага камісара ў трылогіі «Дума пра Каўпака». Мы з Вамі, Віктар Цімафеевіч, не адзін раз гутарылі аб тым, як гэты акцёр з сапраўднай партыйнай страсцю паглыбляўся ў вобраз камуніста Руднева, імкнучыся гранічна праўдзіва, па-жыццёваму пераканаўча і памастацку ёміста паказаць свайго героя. Пра яго творчы ўклад у нашу агульную работу ўжо шмат напісана ва ўсхваляваных пісьмах гледачоў, у даследаваннях гісторыкаў і кіназнаўцаў. Мне асабіста яго выступленне ў гэтай ролі бачыцца больш чым звычайная акцёрская ўдача. Валянцін Белахвосцік — сам чалавек нялёгкага жыццёвага лёсу, здатны на глыбокі роздум аб перажытым, працавіты, таварыскі. Мабыць, ён аддаваў вобразу Сямёна Васільевіча Руднева штосьці самае запаветнае са сваёй душы.

Спадзяюся, што Вы, Віктар Цімафеевіч, сустрэнецеся ў гэтыя дні з маім і нашым агульным сябрам-паплечнікам, дык прашу, калі ласка, абдыміце яго і перадайце яму мае віншаванні.

Не магу не сказаць і аб тым, што беларускі кінематограф уносіць у нашы творчыя пошукі адчувальны імпульс, уліваецца ў агульны паток савецкага мастацтва акрэсленай і адметнай плынню. Сёння я не буду паглыбляцца ў разгляд Вашых, Віктар Цімафеевіч, і Вашых калег фільмаў. Упэўнены, што даследчыкам і гісторыкам кінамастацтва студыя «Беларусьфільм» дае багаты матэрыял для асэсавання выдатных твораў аб вайне, аб народным подзвігу. Прадстаўнікі ўсіх пакаленняў беларускіх кінематаграфістаў маюць на сваім рахунку значныя творы. Гэтым вы ўносіце свой уклад у агульнанародную скарбніцу ідэйна-эстэтычных каштоўнасцей...

За святочным сталом не заўсёды зручна займацца заглыбленымі філасофскімі разважаннямі, ці не так? Аднак мяне «падмывае» выказаць думку аб тым, што Вы і Вашы калегі ўпэўнена ажыццяўляеце ў сваёй мастацка-творчай практыцы прынцыпы сацыялістычнага рэалізму, выяўляеце партыйную мэтанакіраванасць. Гэта сведчыць аб ідэйнай сталасці кадраў беларускага кіно. Зразумела, мы з Вамі, маючы асабісты вопыт, ведаем, што працэс стварэння кінатвораў не абыходзіцца без пралікаў, без выдаткаў, а часам і без памылак. Рознае здараецца. Бывае, што нашым фільмам нестае змястоўнасці, зліцця высокага прафесійнага майстэрства з глыбінёй даследавання чалавека і часу. Крыўдна пра гэта гаварыць, але і сёння нам варта яшчэ пераадольваць праявы шэрасці, бязлікасці.

Лепшыя работы нашых беларускіх калег, як і агульныя перадавыя тэндэнцыі савецкага экраннага мастацтва, усяляюць упэўненасць, што мы здолеем паспяхова вырашыць ускладзеныя на нас задачы. Тут вельмі патрэбна тая сяброўская шчырасць, якая звязвае нас з Вамі, Віктар Цімафеевіч, і ў прыватным, і ў агульным значэнні.

Раптам я прыгадваю тую вясну ўжо далёкага цяпер (як імкліва ляціць час!) шасцідзесятага года, калі я быў Вашым госцем у Мінску ў часе вялікага кінафестывалю. Тады мінчане глядзелі маю «Кіяўлянку». І дагэтуль я помню, як мой сябра, нябожчык Віктар Іўчанка, і я разам з масквічамі і іншымі ўдзельнікамі фестывалю выказваліся на старонках беларускіх газет. Вы ж таксама, відаць, гэта помніце: мы ўсе выказвалі спадзяванні, што фільмы гаспадароў таго кінематаграфічнага форуму абавязкова будуць сярод пераможцаў. І не толькі на гэтым, а і на ўсіх маючых адбыцца аглядах і конкурсах.

Што ж, я маю гонар сказаць, што гэтыя спадзяванні не аказаліся марнымі. Сёння, калі святкуецца 60-годдзе БССР і Кампартыі Беларусі, ваш кінематаграфічны атрад выглядае вартым высокіх пахвал, згуртаваным і сталым падраздзяленнем у савецкім мастацтве. Хай жа Новы год будзе прычынай для падвядзення радасных вынікаў і абяцае новыя адкрыцці і дасягненні на будучыню!

Абдымаю Вас, Віктар! Абдымаю маіх сяброў, маіх братоў на Беларусі!

Цімафей ЛЯЎЧУК.

МАСТАКОЎСКАЕ СУЛАДДЗЕ

...Другі канцэрт для фартэпіяна з аркестрам соль мінор Сяргея Пракоф'ева выконваюць лаўрэат Міжнароднага конкурсу Ігар Алоўнікаў і Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР, дырыжор — лаўрэат Міжнароднага конкурсу «Фонд Герберта фон Караяна» Марыс Янсанс. Два маладыя музыканты, перад імёнамі якіх стаіць званне «лаўрэат», сустрэліся на сцэне канцэртнай залы філармоніі, каб прадэманстраваць мінскім слухачам сапраўдны прафесіяналізм, мастакоўскую патрабавальнасць і напал пачуццяў.

Ігар Алоўнікаў — піяніст, цікавы сваёй здольнасцю да творчага пошуку: зварот да рэдка выконваемых з эстрады твораў, глыбокае пранікненне ў свет музычных вобразаў, стварэнне ўласных трансгрыпцый. Вось і цяпер гучаў твор, напісаны ў «нетыповай» форме чатырохчасткавага канцэрта, дзе канструктыўнасць і дакладнасць спалучаюцца са стыхійнай імправізацыйнасцю. З першай жа спакойнай, некалькі архаічнай у сваім багацці квартавых і квінтавых хадоў тэмы Алоўнікаў пачаў «ляпіць» шматфарбны, разнастайны свет пракоф'еўскіх вобразаў. Грандыёзная па маштабах і напружанасці гучання кадэнцыя 1-ай часткі—кульмінацыя, дзе розныя формы акордавай тэхнікі, раскаты арпеджый і ўзлёты гамаў, выкананыя віртуозна, стварылі эфект бесперапыннага ўзрастання. У імклівым скерца паток пасажаў фартэпіяна, якія зіхацелі над партыяй аркестра, паказаў бездакорную дакладнасць артыкуляцыі піяніста. Трэцяя частка—інтэрмецца—перавага гратэскавасці, увасобленай у вуглаватых інтанацыях басоў і ў вострых гучаннях пасажаў фартэпіяна. Малады выканаўца падкрэсліў арыгінальныя гратэскавыя павароты, то наўмысна грубаватыя, то нечакана прыгожыя. У фінале імклівасць руху адценена лірыкай сярэдняга эпізоду, дзе піяніст спакойна, плаўна, на шырокім дыханні правёў адну з лепшых пракоф'еўскіх мелодый.

Дырыжор Марыс Янсанс дакладна арганізаваў складаную разгорнутую форму твора ў адзінае цэласнае, гібка аперываў гукадынамічнай і тэмбравай палітрай, дабіўшыся выдатных суадносін інструментаў, груп, саліста і ўсяго аркестра. У выніку чатыры часткі канцэрта С. Пракоф'ева ўтварылі насычаную кантрастамі музычную фрэску, якая, калі ўспомніць выказванне Б. Асаф'ева, «выклікае ва ўяўленні дзіўныя і пышнакапрызныя архітэктурныя формы фантазіі стылю барока...»

Поўную кантактнасць з аркестрам, імпульсіўнасць, здольнасць зацікавіць і выканаўчы калектыў, і залу, надзвычай пластычны і вобразна-выразны жэст, артыстычнасць прадэманстраваў Марыс Янсанс у «Фантастычнай сімфоніі» Г. Берліёза (другое аддзяленне вечара). Дырыжор паказаў феерычны бляск аркестроўкі, пераканальна раскрыў суровы лёс узвышанага, але трагічнага героя-адзіночкі, якім, зрэшты, быў і сам кампазітар Г. Берліёз.

І. ГУРАРЫЙ.

На здымку: І. Алоўнікаў (злева) і М. Янсанс у час рэпетыцыі.

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

«...ГОРАДУ, ШТО Ў ЦЭНТРЫ КАНТЫНЕНТУ»

Некаторыя з'явы, знаёмыя яшчэ з дзяцінства, часам нібы адкрываюцца нам нанава, прадстаюць у нейкім іншым святле.

Па сваім геаграфічным становішчы Мінск знаходзіцца амаль у самым цэнтры Еўропы.

Сёння наш Мінск не толькі цэнтр грамадска-палітычны, індустрыяльны, гандлёвы і культурны, але гэта адзін з цэнтраў міжнароднага турызму.

Шмат турыстаў з розных краін штодзённа прыязджае ў сталіцу БССР. І ўсе яны заўсёды адчуваюць гасціннасць жыхароў Мінска. З асаблівай ветлівасцю сустракаюць мінчане простых працоўных, служачых, прафсаюзных дзеячаў — усіх тых, хто прыехаў да нас па лініі так званага прафсаюзнага сацыяльнага турызму.

Сацыяльны турызм у апошні час набывае ўсё большае распаўсюджанне. Толькі па лініі прафсаюзаў Мінск у гэтым годзе наведалі каля 14 тысяч турыстаў. І гэта не выпадкова. Усё большая колькасць людзей едзе ў Савецкі Саюз не толькі дзеля прыемнага адпачынку, але і дзеля таго, каб лепш пазнаць жыццё савецкіх людзей, пазнаёміцца з дасягненнямі сацыялізму. Пашыраецца геаграфія краін, адкуль прыязджаюць да нас госці. Сёлета ўпершыню Мінск наведалі турысты з Іспаніі і Партугаліі.

Вось што напісалі ў кнізе водгукаў «Інтурыста» італьянскія муляры з Мадэны: «Хацелася б падкрэсліць, што нам сімпатычны горад Мінск не толькі як горад, які цікава наведаць, але перш за ўсё таму, што менавіта ў Мінску адбываюцца значныя сацыяльныя пераўтварэнні».

А вось другі запіс — групы чэшскіх турыстаў: «Горад Мінск — гэта прыклад таго, што можа стварыць чалавек, што можа стварыць сацыялістычнае грамадства. Чэсць працы!».

З самых розных па сваім сацыяльным укладзе краін прыязджаюць да нас турысты. І на ўсіх Мінск робіць моцнае, незвычайнае ўражанне.

«Як кіраўнік групы Унітарнага прафцэнтра працоўных Венесуэлы павінна сказаць, што мы зачараваны гасціннасцю мінчан і ад усёй душы палюбілі яго людзей», — піша Соня Ла Торрэ. І дадае: «Няхай жыве СССР! Няхай жыве Камуністычная партыя! Няхай жыве Мінск! Няхай жыве Венесуэла!»

Захапленне самім Мінскам, яго сённяшнімі дасягненнямі натуральна пераходзіць у пачуццё падзякі жыхарам горада, у захапленне гераічнай гісторыяй, у пачуццё салідарнасці.

«З вялікай цікавасцю глядзелі мы на гэты вялізны і цудоўны горад, які вырас з руін», — пішуць венгерскія турысты. Вось яшчэ: «Мінчане добразычліва прынялі нас у сваім горадзе, поўным духмяных соснаў і цудоўных заводаў. Італьянскія турысты».

«Мы ў вашым цудоўным горадзе былі тры дні і ўсюды сустракалі цёплы і сардэчны прыём. Вы нам паказалі цудоўны горад, пабудаваны вашым працавітым народам. Тадэвуш Ванага, ПНР».

Вось што напісалі госці з далёкай краіны Узыходзячага сонца: «Мы даведаліся, што жыхары Мінска ў час другой сусветнай вайны перанеслі вялікія пакуты. Даведаліся і аб трагедыі вёскі Хатынь. Японскі народ таксама меў шматлікія ахвяры ў гэтай вайне. Мы, як і жыхары Мінска, ніколі не забудзем аб жудаснай вайне. Жадаем ад усяго сэрца, каб народы свету жылі ў дружбе». Кіраўнік дэлегацыі савета прафсаюза працаўнікоў транспарту Японіі «Тосіко».

З гэтымі словамі перакліканюцца радкі аднаго пісьма з Дармштата (ФРГ). Трэба адзначыць, што ў адрас бюро сацыяльнага прафсаюзнага турызму, якое створана ў Мінску, прыходзіць шмат пісем і ўсе яны пачынаюцца з падзякі супрацоўнікам гэтага бюро за нязменную ўвагу і клопат аб замежных турыстах.

Жыхар Дармштата Рольф Бікельхаўпт піша: «Спадзяюся, што мы будзем жыць у міры. Наша знаходжанне ў вас дапамагло выкрыццю забабонаў адносна мірнай палітыкі СССР».

Зразумела, не ўсе госці з капіталістычных краін так лёгка развітваюцца са шматлікімі «забабонамі».

Аднойчы з Францыі прыйшоў у Мінск сярдзіты допіс. Яго аўтар абураўся тым, што ў праграму знаёмства з горадам Мінскам уваходзіць наведванне музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ён лічыць гэта актам савецкай прапаганды, зазначае, што не трэба варушыць цені «даўно мінулага», тым больш ваеннага мінулага, бо вайна — гэта брудная справа, у якой людзі гінуць дзеля ідэалогіі, быццам бы чужой усім простым салдатам.

Што можна адказаць на гэта? Лепш за ўсё было б, каб яго аўтар прачытаў паэму сваіх суайчыннікаў Луізы і Рабера Мацісаў з маленькага гарадка Савіны. Паэму, «напісаную сэрцам» пасля наведвання Хатыні, як пазначылі яны самі ў сваім пісьме.

Паэма гэта называецца «Хатынь». Яе аўтары — не прафесійныя паэты. Але напісана яна сапраўды сэрцам: шчырым болем, з пачуццём далучанасці да ўсяго, што адбывалася і адбываецца на планеце.

Так ужо адбывалася ў гісторыі, што наш горад нярэдка станавіўся на скрыжаванні шляхоў вайны. Сёння ён упэўнена стаіць на дарозе міру і сацыялізму.

Таму, відаць, адно з самых шчырых і сяброўскіх пісем прыйшло з Фінляндыі — краіны, якая шмат зрабіла дзеля ўмацавання міру ва ўсім свеце.

«Прывітанне і ўдзячнасць ад усёй групы з Турку за клопат аб нас у час паездкі па Беларусі. Мы ўбачылі, што Беларусь — краіна палёў і лясоў, блакітных азёраў і рэк, і што ў гэтай краіне — народ працавіты і гасцінны. У вашай рэспубліцы, як і ўсюды ў Савецкім Саюзе, старанна працуюць, праца змяніла твар краіны і жыццё людзей. Карла Лепалуота».

Гэтыя словы, напісаныя сэрцам нашых сяброў з розных краін, дапамаглі яшчэ раз убачыць наш горад — убачыць яго прыгажосць, яго сілу, яго веліч.

Дадзім апошняе слова Барбары Лем з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. «Мы наведалі Курган Славы і мемарыяльны комплекс Хатынь. Мы стаялі моўчкі і пакланіліся. Мы ведаем, што тут (у Мінску) не толькі жылі героі ў час вайны: тут жывуць героі, якія будуюць светлую будучыню».

Віталь ТАРАС.

НАВАГОДНІЯ ПРЫГОДЫ

Мал. Н. ДОРАШ.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 12345678910 12345678910 АТ 20708

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО.